PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://republika.pl/niva_bielastok/
niva_bielastok@poczta.onet.pl
niva_bielastok@skrzynka.pl

№ 22 (2403) Год XLVII | Беласток 4 чэрвеня 2002 г. | Цана 2,00 зл.

Дзесятая гадавіна аб'яднання Польшча-Беларусь

Віктар Швед

У „Доме дружбы" ў Варшаве (вул. Маршалкоўская, 115) маюць свае сядзібы няўрадавыя грамадскія арганізацыі Аб'яднанне супрацоўніцтва Польшча-Усход, Аб'яднанне Польшча-Беларусь і Турыстычнае прадпрыемства „Калінка".

14 мая г.г. адбылося пасяджэнне прэзідыума Галоўнага праўлення Аб'яднання Польшча-Беларусь з удзелам старшынь Ваяводскіх аддзелаў гэтага Аб'яднання: Лодзінскага, Люблінскага, Любускага, Мазавецкага, Падляшскага і Паморскага.

Тэмай пасяджэння была інфармацыя аб дзейнасці Аб'яднання за апошні перыяд і абмеркаванне плана падрыхтоўкі да III Кангрэса Аб'яднання Польшча-Беларусь.

Пасяджэнне адкрыў старшыня ГП Аб'яднання д-р Баляслаў Хмялінскі. Прывітаў ён сардэчна ўсіх прысутных і паінфармаваў, што ў гэтым годзе Аб'яднанне канцэнтравала сваю ўвагу на наступных мерапрыемствах:

1. Супольна з Кафедрай беларускай філалогіі Варшаўскага універсітэта правяло ўжо VIII выпуск Алімпіяды беларускай мовы ў агульнаадукацыйных ліцэях з беларускай мовай навучання ў Бельску-Падляшскім і Гайнаўцы. У чэрвені г.г. лаўрэаты Алімпіяды паедуць у Беларусь.

2. 4 сакавіка г.г. Аб'яднанне супрацоўніцтва Польшча-Усход, Аб'яднанне Польшча-Беларусь і Пасольства Рэспублікі Беларусь у Варшаве правялі Варшаўскую міжнародную канферэнцыю, прысвечаную дзесяцігоддзю ўстанаўлення дыпламатычных зносін паміж Польшчай і Рэспублікай Беларусь. Прынялі ў ёй удзел прадстаўнікі ўрадаў, дэпутаты, грамадскія і самаўрадавыя дзеячы.

3. У днях 13-15 сакавіка г.г. у Брэсце наладжана была першая сустрэча супрацоўнічаючых з сабою гарадоў Польшчы і Беларусі.

Шырэй аб гэтых мерапрыемствах паінфармаваў прысутных намеснік старшыні ГП Аб'яднання Польшча-Беларусь Юзаф Брыль, які адначасова з'яўляецца дырэктарам Турыстычнага прадпрыемства „Калінка". Дакладчык падкрэсліў, што Аб'яднанне Польшча-Беларусь і Аб'яднанне супрацоўніцтва Польшча-Усход ад многіх гадоў здзяйсняюць заданні, мэтай якіх з'яўляецца ўстанаўліванне і ўтрымліванне добрасуседскіх адносін з дзяржавамі з-за ўсходняй граніцы. Апошнія гады былі спрыяючымі наладжванню, утрымліванню і развіццю так званых „Рэгія-

[працяг ☞ 2]

„Крыніца" ставіла дажынкі. Фота Міры ЛУКШЫ

Агляд абрадавых сцэнак...

Янка Целушэцкі

... адбыўся 19 мая 2002 года ў Гарадоцкім доме культуры. Выступілі з імі пятнаццаць фальклорных калектываў (для прыкладу ў 1995 годзе ў гэткім аглядзе ў Гмінным асяродку культуры ў Нарве ўдзельнічалі ўсяго чатыры калектывы: з Краснага Сяла, Паўлаў, Старога Ляўкова і Тыневічаў-Вялікіх). Першае такое мерапрыемства адбылося 9 чэрвеня 1994 года таксама ў Нарве.

Сёлета было што паглядзець і паслухаць. „Хрысціны" ставілі чатыры калектывы: „Малінка" з Маліннік, маладзёжны гурток з Бельскага дома культуры ды самадзейнікі з Рыбалаў і Паўлаў (з гэтых дзвюх вёсак разам 16 чалавек). Вядома, рэквізітамі былі замест нованароджанага дзіцяці лялькі велічынёю тых вялікіх. Усе калектывы справіліся з задачай паспяхова. Нованароджаных дзяцей хрысцілі то Данілам, то Паўлікам (гэта тады, калі хлопчык нарадзіўся якраз у свята Пятра і Паўла). Шматасабовы гурт з Бельска-Падляшскага праспяваў пры тым прыгожую прызабытую песню. Аказваецца, варта дабівацца да таго, што ў народнай глыбіні. Тут нізкі паклон кіраўнічцы калектыву БДК Альжбеце Фіёнік. Апрача яе ўмела, амаль прафесійна, падабралі і вырэжысіравалі сцэнкі дзве іншыя кіраўнічкі — Вера Нічыпарук з Маліннік і Лідзія Мартынюк з Рыбалаў.

Тры беларускія абрадавыя мастацкія калектывы выступілі са сцэнкай „Вячоркі". Гэта — „Крыўчанкі" з Крыўца, „Каліна" з Дашоў і „Асенні ліст" з Гарадка. Прыгожыя колішнія песні ды жартоўныя сцэнкі стварылі вясёлы настрой. Усё адбывалася так, як запланавалі кіраўнікі калектываў: Люба Дубко з Крыўца, Зося Кердалевіч з Дашоў і Тамара Сянкевіч з Гарадка.

З вясельным абрадам выступілі на гарадоцкай сцэне „Красуні" з Краснага Сяла (у іх выкананні была сцэнка „Пераможвіны"), „Тыневічанкі" з Тыневічаў-Вялікіх („Заручыны") і „Васілёчкі" з Бельска-Падляшскага („Прыданне"). Самадзейнікі, асабліва з Краснага Сяла пад кіраўніцтвам Валянціны Марціновіч (яна шматгадовы кіраўнік), з Бельска-Падляшскага (кіраўнік Мікалай Мяжэнны) праспявалі шмат даўніх абрадавых песень. Агульна кажучы, усе „вясельнікі" добра сыгралі свае ролі. „Расспяваны Гарадок" пад кіраўніцтвам Ніны Цыванюк ды „Журавінкі" з Агароднічкаў (кіраўнічка Ніна Аўгустыновіч) захапілі гледачоў сваім выкананнем песень, прысвечаных прыходу вясны — прызабытых „вяснянак". У „Журавінак" былі гэта „канапелькі", а ў „Расспяванага Гарадка" — „гуканне вясны". Гэтыя калектывы маюць за сабой шмат гадоў працы і багаты сцэнічны вопыт.

Два калектывы: „Арэшкі" з Арэшкава ды „Крыніца" з Беластока добра праявілі сябе ў абрадзе „Дажынкі". На вылучэнне заслужыла Люба Гаўрылюк з беластоцкай „Крыніцы". Ансамблі падабралі для сцэнак самыя прыгожыя жніўныя песні. Адшуканыя, меладычныя, ствараючыя настрой гэтага летняга земляробчага абраду.

„Цаглінкі" са Старога Ляўкова ставілі нешта новае на нашай сцэне — абрад „Талака". Удзельнічала ў сцэнцы

[працяг ☞ 2]

Ахвота паразумецца ☞ 2

Пасля двух гадоў стараннуў і пагадненняў з беларускім бокам радныя Падляшскага сейміка прынялі пастанову-праект паразумення паміж Падляшскім ваяводствам і Гродзенскай вобласцю. Ініцыятарам праекта паразумення быў праваслаўны радны...

Для аматараў першабытнай прыроды ☞ 3

Пабываючы ў Белавежы, пацікавіўся я што турыстам прапануе сталіца пушчы. Гэтага дня, а быў гэта пачатак доўгага ў краіне маёвага уік-энду, Белавежа прыцягнула многа турыстаў, дарослых і дзяцей. Сярод наведвальнікаў заўважалася спакойная, няспешлівая атмасфера. Нават і на шашы шафёры запавольвалі ход машын ад захаплення пушчай.

Еўрапеізацыя Пээнэру ☞ 4

Розніца паміж камуністычнай Польшчай і посткамуністычнай толькі такая, што ў гэтай першай улады прытрымліваліся аднаго са сваіх ідэалагічных прынцыпаў — імкнення да сацыяльнай роўнасці ўсіх грамадзян. У посткамуністычнай — улады прынялі ў гэтай справе псеўдаліберальную дактрыну...

Жывыя абразкі роднай гісторыі ☞ 8

„Нарысы па гісторыі Беларусі" Юры Весялкоўскага не прачытаеш за адзін вечар — у кнізе семсот старонак. Лепш яе чытаць не спяшаючы, па раздзелах, прыглядаючыся ўважней уваскрэслым героям і падзеям сівой мінуўшчыны. Аўтар насамрэч піша як быццам асобныя расказы, якія можна чытаць і не па чарзе.

Праваслаўнае школьніцтва даўней і сёння ☞ 9

Архіепіскап Іакаў, які ва ўступным рэфераце расказваў пра розныя формы школьніцтва ў першых вяках хрысціянства, м.інш. пра школы катэхуменату ў хрысціянскіх гмінах і тэалагічныя школы, прыпомніў словы Хрыста: „Ідзіце і навучайце ўсе народы".

Думала — выканчуся ☞ 10

Завезлі нас у Пількопен; суседку далі да багатага, а мяне да беднага гаспадара. Будынкі былі растрэсены, многа дзяцей малых. Гаспадар піў, а гаспадыня лічыла сябе вялікай паняй. Было восем кароў і двое коней. Я аднаго коніка запрагала ў керат, вочы яму мехам затуляла і так сечку рэзала. Поўная клуня снегу, салома мокрая, сячкарня не цягне...

9 770546 196000

Беларусь — беларусы

Самадзейнікі з Залук. Фота Міры ЛУКШЫ

Агляд абрадавых сцэнак

[1 ☞ працяг]

адзінаццаць чалавек, у тым ліку пяць чалавек выступіла на сцэне ўпершыню. Хаця вельмі хваляваліся, усё атрымалася надзвычай удала. Ігралі шэсць жанчын і пяць мужчын (ім брава за адвагу, зацікаўленне і ахвоту). Усе разам стварылі радасны сямейны настрой.

Важна пры ўсім сказаным, што на сцэне выступалі і маладыя, і старэйшыя самадзейнікі. У многіх з іх прыродны талент. Кіраўнікі-рэжысёры праявілі вялікае ўменне ствараць, а то й умела выбраць цікавыя абразкі з вясковага жыцця-быцця.

Арганізатарамі сёлетняга агляду беларускіх абрадавых мастацкіх калектываў, якія дзейнічаюць на Беласточчыне, былі Галоўнае праўленне БГКТ, войт Гарадоцкай гміны і дырэктар Гарадоцкага дома культуры. Мерапрыемства было ўдалае. Астанецца яно надоўга ў памяці гледачоў і выканаўцаў. Варта пры тым адзначыць, што ўсе-ўсе выканаўцы атрымалі ва ўзнагароду камплекты пасцелі. Як выканаўцаў, так і пасцельных камплектаў было вельмі многа. Самадзейнікі былі задаволены дыпломамі і пасцеллю фірмы „Кора".

Янка ЦЕЛУШЭЦКІ

Дзесятая гадавіна аб'яднання Польшча-Беларусь

[1 ☞ працяг]

нальных пагадненняў" паміж адміністрацыйнымі адзінкамі, самаўрадамі і камерцыйнымі арганізацыямі з іх партнёрамі на Усходзе. Саюзнікамі ў рэалізацыі гэтых задач з'яўляюцца самаўрадавыя і адміністрацыйныя ўлады розных ступеняў, якія часта больш за дзяржаўныя ўлады зацікаўлены супрацоўніцтвам з дзяржавамі Усходу ў галіне гаспадаркі, а таксама культуры, навукі, турызму і спорту.

Варшаўская міжнародная канферэнцыя, прысвечаная дзесятай гадавіне ўстанаўлення дыпламатычных зносін паміж Польшчай і Рэспублікай Беларусь пацвердзіла, што існуюць аб'ектыўныя ўмовы да пераадольвання існуючых бар'ер і стэрэатыпаў, рэалізацыі нявыкарыстаных дагэтуль магчымасцей і інтэнсіфікацыі двухбаковага дыялогу ва ўсіх галінах жыцця.

Вялікае значэнне, — сказаў Юзаф Брыль, — будзе мець першая сустрэча гарадоў-пабрацімаў Рэспублікі Беларусь і Польшчы. У гэтай сустрэчы прыняла ўдзел сотня польскіх дзяржаўных і самаўрадавых дзеячаў з сарака гарадоў нашай краіны. Запладаносіць гэта вялікай колькасцю новых кантрактаў паміж адміністрацыйнымі і самаўрадавымі адзінкамі Польшчы і Рэспублікі Беларусь.

Брэсцкая сустрэча напэўна прычыніцца да здзяйснення лозунга нашых Аб'яднанняў: „Ад добрага кантакту да добрага кантракту", — падсумаваў сваё выступленне Юзаф Брыль.

На заканчэнне пасяджэння пастаноўлена сустрэцца яшчэ 20 чэрвеня г.г. — у дзесяцігоддзе дзейнасці Аб'яднання Польшча-Беларусь — дзеля падрыхтоўкі матэрыялаў на III асенні справаздачна-выбарчы Кангрэс Аб'яднання.

Ваяводскія аддзелы Аб'яднання забавязаны правесці да гэтага часу справаздачна-выбарчыя сходы.

Віктар ШВЕД, намеснік старшыні Аб'яднання Польшча-Беларусь

З беларускага друку

Пра тое ды сёе

Супрацоўніцтва

Кітайцы лічаць, што супрацоўніцтва Беларусі і Кітая ў навуковай сферы мае вялікія перспектывы. Урад правінцыі Шаньдун інвесціраваў каля 62 мільёны юаняў на падрыхтоўку тэрыторыі для беларуска-кітайскага тэхнаполіса, 15 мільёнаў юаняў на набыццё навуковага абсталявання для лабараторый і 1 млн. юаняў на даследаванні па ўзгодненых праектах. Вучоныя дзвюх краін ужо ўключылі 9 праектаў у план супрацоўніцтва на міжнародным узроўні. Усяго ж беларускія навукоўцы прапанавалі для супольных даследаванняў 800 праектаў, 150 з якіх былі адобраны для наступнай практычнай рэалізацыі.

Літаратура

Было б смешна і глупа адмаўляць тое катастрафічна хуткае падзенне цікавасці да літаратуры і да асобы пісьменніка, якія мы назіраем апошнім часам, — піша ў ЛіМе намеснік старшыні Саюза беларускіх пісьменнікаў Навум Гальпяровіч. Кнігарні нагадваюць супермаркеты заможнага Захаду, дзе ёсць усё, а купляюць мала. Тыражы кніг і часопісаў зніз**і**ліся настолькі, што ніхто з маладых, бадай, не паверыць у тое, што параўнальна не так даўно кніжкі беларускіх аўтараў маглі выходзіць (прынамсі, дзіцячая і юнацкая літаратура) па 20-30 тысяч экземпляраў кожная, а часопіс „Полымя" выпісвалі да дзесятка тысяч чытачоў.

Узброеныя Сілы

Да 2006 года Узброеныя Сілы Беларусі будуць скарочаны да 65 тысяч чалавек. Аднак скарачэнне не самамэта. У шэрагу выпадкаў будуць нават фарміравацца новыя воінскія часці. А за кошт перааснашчэння новым узбраенн**е**м і тэхнікай баявая магутнасць арміі не знізіцца, а павялічыцца. Задача армейскай рэформы, канцэпцыя якой распрацавана да 2010 года, — гэта будаўніцтва такіх Узброеных Сіл, якія б былі гатовы да сучаснай вайны і да сучаснай узброенай барацьбы.

Экалогія

На Мінскім мотавелазаводзе працягваюцца работы па „даводцы" даследнага ўзора экалагічнага матацыкла з чатырохтактным рухавіком кітайскай вытворчасці. Яго выпрабаванні запланаваны на лета, а да выпуску прамысловай партыі прадпрыемства рыхтуецца прыступіць восенню. Калі ўсё будзе ісці добра, новыя матацыклы будуць пастаўляцца як за межы краіны, так і на ўнутраны рынак.

Медыцына

У Гродне асвоілі тэхналогію вытворчасці лейцыну, лякарства, што вырабляецца на аснове амінакіслот. Гродзенскі лейцын — сапраўдны прарыў у медыцыне постсавецкай прасторы. Дзевяноста лекаў на аснове амінакіслот вырабляецца ў Японіі. Беларусам удалося асвоіць лейцын за год. Непасрэднай вытворчасцю таблетак займаецца Барысаўскі завод медыцынскіх прэпаратаў. Лек валодае імунамадэліруючым эфектам, не выклікае алергіі, не ўплывае на развіццё пухлін. Але лейцын — не сродак ад раку і ён — суправаджаючы прэпарат пры лячэнні хваробы, а таксама ў час рэабілітацыі хворага. Вельмі станоўча спрыяе лячэнню алкагалізму і залежнасці ад тытуню.

Ужо Еўропа

Удалая палітыка па стабілізацыі курса беларускага рубля выклікала апошнім часам нездаровы энтузіязм сярод айчынных фальшываманетчыкаў, якія ўсё часцей бяруцца за падробку банкнотаў Нацбанка. Чарговая буйная партыя фальшывак канфіскавана ў Магілёве. Тут у сваёй кватэры затрыманы студэнт Магілёўскага дзяржаўнага тэхналагічнага універсітэта і рабочы аднаго з адкрытых акцыянерных таварыстваў. Праваахоўнікі канфіскавалі ў затрыманых 26 фальшывых купюр Нацбанка вартасцю па 1 тысячы рублёў і 6 — вартасцю 5 тысяч рублёў.

Вычытаў Рыгор ЛЯСУН

Ахвота паразумецца

Пасля двух гадоў старанняў і пагадненняў з беларускім бокам радныя Падляшскага сейміка прынялі пастанову-праект паразумення паміж Падляшскім ваяводствам і Гродзенскай вобласцю.

— У праекце няма падрабязнасцей. Знаходзяцца яны ў асобных дамовах, якія кранаюць паасобныя пытанні. Паразуменне гэта падстава для падпісвання тых дамоў, — сказаў падляшскі маршалак Славамір Згжыва.

Ініцыятарам праекта паразумення быў праваслаўны радны з Клуба СЛД Ян Зенюк. Радныя аднагалосна падтрымалі праект. У час дыскусіі над ім, аднак, не абышлося без слоў крытыкі. Праекту ставілася ў закід павярхоўнасць. Прафесар Адам Дабронскі патрабаваў запісу, які датычыў бы ўзаемнай аховы культурных каштоўнасцей.

— Нашым абавязкам дбаць аб важныя для гісторыі абодвух народаў месцы, як могільнікі ці помнікі.

На думку маршалка Згжывы, такія пытанні будуць запісаны якраз у асобных дамовах. Як і справы звязаныя з пабудовай дарог, тэрміналаў на пагранпераходах, арганізацыяй кірмашоў, культурным абменам.

— Намерваемся супрацоўнічаць ва ўсіх галінах. У Гродзенскай вобласці памяняўся ў апошні час клімат супрацоўніцтва. Да таго Беларусь атрымала доступ да сродкаў з Еўрасаюза. Калі дойдзе да падпісання паразумення, яшчэ невядома. Управа ваяводства чакае згоду яе заключыць у Міністэрстве замежных спраў. Можна спадзявацца, што атрымае яе хутка, узважыўшы прыхільныя адносіны да міжрэгіянальных польска-беларускіх кантактаў шэфа МЗС Владзімежа Цімашэвіча.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Так „шануюцца" славутасці

У Баранавічах не будзе гімназіі імя Ігната Дамейкі — гарадскія ўлады забаранілі прысвоіць імя беларускага навукоўца навучальнай установе горада. З прапановай назваць адну з гімназій імем Дамейкі выступіла мясцовае аддзяленне Таварыства беларускай мовы. У сваім адказе чыноўнікі спасылаюцца на тое, што ў горадзе існуе толькі 7 беларускіх класаў, а таму існаванне гімназіі з імем Дамейкі немэтазгоднае.

Перакананы, што баранавіцкім чыноўнікам добра вядома, што І. Дамейка праславіў Беларусь далёка за яе межамі. Вядомы беларускі географ і геолаг, які нарадзіўся ў Карэліцкім раёне Гродзенскай вобласці, быў адным з першых даследчыкаў Чылі. У сталіцы Чылі яму паставілі помнік і шануюць як нацыянальнага героя. Гэты год ЮНЕСКА быў аб'яўлены годам І. Дамейкі. А ягоныя землякі — баранавіцкія чыноўнікі, лічаць немэтазгодным прысвоіць ягонае імя адной з школак горада. Прычым, звярніце ўвагу — па якіх матывах. Што ж, застаецца параіць баранавіцкім чыноўнікам назваць школу імем Пятра І, альбо Івана Жахлівага. Напэўна, гэта будзе адпавядаць сучаснаму стану рэчаў.

А калі сур'ёзна — да чаго мы людзі дажыліся?

М. МІКАЛАЙЧЫК

„Биржа информации", 16.05.2002 г.

Пра алкаголь і чысціню

У час апошняй сесіі Рады горада Гайнаўкі радныя займаліся, між іншым, назвай вуліцы, празмерным спажываннем алкаголю і ўтрыманнем чысціні ў горадзе.

Не для „Сасновай сеці”

Камісія асветы, культуры і аховы здароўя прапанавала назваць адну з новых гайнаўскіх вуліц „Сасновай сеццю”. Так называліся лугі, на якіх зараз знаходзіцца згаданая вуліца. Гэтую назву памятаюць жыхары Дубін і навакольных вёсак і фіксуецца яна на старых картах. Аднак у галасаванні гэтая прапанова была адкінута і вуліца атрымала названне імя гайнаўскага лекара Ракавецкага.

— Хацелі мы захаваць гістарычную назву, каб засталася яна ў памяці маладых пакаленняў. Аднак, нашай прапановы не падтрымала Управа горада і таму не перайшла яна ў галасаванні, — заявіў радны БНВК Васіль Іванюк, які быў адным з ініцыятараў захавання старой назвы.

10 пляшак на душу

У некаторых магазінах і рэстаранах прадаюць моладзі алкаголь, хаця законы забараняюць гэта. Маладыя людзі ў Гайнаўцы п’юць алкаголь у публічных месцах і парушаюць публічны парадак у горадзе. Здараюцца выпадкі, што маладыя нецвярозыя людзі затрымліваюць машыны і пешаходаў дзеля забавы. Хаця прадаўцы наракаюць, што апошнім часам у Гайнаўцы продаж алкаголю ў магазінах падае, а гарэлку з-за ўсходняй мяжы можна купляць на рынку, то за апошні год у гайнаўскіх магазінах прадалі алкаголю на 9 мільёнаў 582 тысячы злотых. Атрымліваецца, што кожны статыстычны жыхар Гайнаўкі выдаў на гарэлку амаль 400 злотых. Радныя раілі праводзіць адукацыйныя сустрэчы з моладдзю, дзеля выхоўвання яе ў цвярозасці. Прапанавалі таксама, каб працаўнікі гарадской службы аховы кантралявалі ці ў рэстаранах, кафэ і магазінах не прадаецца алкаголь непаўналетнім.

Не штрафаваць старых людзей

Радны Міхал Байко, старшыня клуба радных БНВК, звярнуў увагу на брудныя вуліцы і прапанаваў штрафаваць тых, што не хочуць прыбіраць каля сваіх панадворкаў. Раней радныя прынялі пастанову аб абавязку прыбірання тратуараў каля сваіх сядзіб. Бурмістр паінфармаваў, што ў некаторых выпадках гарадскія ўлады даюць штрафы, але не караюць старых людзей, якім цяжка навесці парадак нават на сваіх панадворках. Да прыбірання каля такіх людзей высылаюцца гарадскія працаўнікі.

Аляксей Мароз

Поспехі і няўдачы

У час апошняй сесіі Рады Гайнаўскага павета радныя адобрылі працу Управы Рады. Староста Уладзімір Пятрочук поспехам назваў стварэнне ў Гайнаўцы Гімназіі з беларускай мовай навучання і адкрыццё Замясцовага аддзялення кіравання асяроддзем Беластоцкага Політэхнічнага інстытута. За апошнюю кадэнцыю ў Гайнаўскім павеце палажылі каля 40 кіламетраў бітумічных дарог. У ліку іншых дасягненняў староста назваў адкрыццё новых аддзяленняў у бальніцы. Да няўдач прылічыў фінансавыя складанасці ў Самастойным публічным комплексе аховы здароўя, пройгрыш дырэкцыі гэтай жа ўстановы ў час судовага працэсу са сваімі працаўнікамі, у сувязі з невыплачваннем ім павышаных зарплат. Староста звярнуў увагу, што ў павеце няма станоўчых рэзультатаў у змаганні з беспрацоўем. Радзе не ўдалося яшчэ прыняць герб і сцяг Гайнаўскага павета.

(ам-з)

Для аматараў першабытнай прыроды

Белавежская пушча і Белавежа — ідэальныя месцы адпачынку для аматараў першабытнага лесу, прыроды, для тых, якія цэняць спакой і камеральную атмасферу прыпушчанскай мясцовасці.

Пабываючы ў маі г.г. у Белавежы, пацікавіўся я ў Бюро турыстычных паслуг што турыстам прапануе сталіца пушчы. Гэтага дня, а быў гэта пачатак доўгага ў краіне уік-энду, Белавежа прыцягнула многа турыстаў, дарослых і дзяцей. Сярод наведвальнікаў заўважалася спакойная, няспешлівая атмасфера. Нават і на шашы шафёры запавольвалі ход машын, ад захаплення пушчанскімі краявідамі.

— У Белавежы ёсць агулам 7 начлежных аб’ектаў, і прыватныя кватэры, якія маглі б прыняць тысячу чалавек нараз, — гаворыць працаўніца бюро Віялета Валкавыцкая. — Турыстычны пік выступае ад мая да кастрычніка.

Белавежскі аддзел Польскага турыстычна-краязнаўчага таварыства распараджаецца ўласным асяродкам — Домам экскурсанта (даўней царская стайня — М. М.) у Палацовым парку ў суседстве музея. На працягу года начуе ў ім 4 тысячы гасцей з краіны і заграніцы.

У Белавежы турыстаў чакаюць кватэры і поўнае харчаванне. Арганізатарам канферэнцый і з’ездаў прапануецца канферэнц-зал з камінам. Індывідуальныя турысты могуць узяць ровар на пракат. Праваднікі, якія ведаюць замежныя мовы, пакажуць самыя цікавыя пушчанскія месцы, напрыклад, шлях каралеўскіх дубоў. Можна пакатацца коннай брычкай, а зімой — санямі, з факеламі.

Ва ўрочышчы Старая Белавежа можна заказаць вогнішча, а да таго — акардэаніста або егера-сігнальшчыка.

* * *

Белавежу наведвае шмат турыстаў, а магло б быць яшчэ больш, калі б не выгляд галоўнай вуліцы мястэчка. У многіх месцах вуліца не прыбраная, а на Маставой, пры бардзюрах, расце пустазелле. Прыбіранне вуліцы гэта абавязак і гмінных улад, і ўладальнікаў нерухомасці. Узорны парадак паправіў бы імідж Белавежы ў вачах турыстаў.

У Белавежы няма буклетаў для турыстаў, якія распавядалі б аб помніках і атракцыёнах пушчы. У Бюро ПТТК, праўда, адзін буклет экспануецца на зашклёным стэндзе высока на сцяне, так што прачытаць яго немагчыма. Ці нельга растыражыраваць такі буклет, каб быў ён даступны кожнаму турысту?

Міхал Мінцэвіч

Фота аўтара

Тры пакаленні

З Вадзімам Федаруком пазнаёміліся мы ў шасцідзесятыя гады, калі ў Вітава з кінаперасоўкай раз’язджаў. Пасябравалі. Потым разам на чыгунцы працавалі. Спярша на перагрузачнай станцыі ў Семяноўцы, пазней у Чаромсе. Зараз мы пенсіянеры. Кожны з нас на бацькоўскім смецці застаўся ды на свой спосаб працуе.

Вандраваў я па наваколлі Арэшкава і рашыў сябрука наведаць. Вітава так змянілася, што не адразу трапіў я на сядзібу калегі. Па брукаванай вуліцы след прастыў. Зараз тут асфальтнае палатно. Выраслі новыя мураванкі. Памаляваныя платы і жалезная агароджа з задбанымі панадворкамі напаміналі, што жыве тут працавіты народ.

— Каля Вадзімавай хаты шыльда з надпісам „Скупка грыбоў” знаходзіцца, — тлумачыў мне незнаёмы мужчына.

Гаспадара я не застаў у хаце. На грыбы з жонкай сабраліся. Тады з дзядзькам Васілём пра мінулае перагаварылі, дык прыяцель з лесу вярнуўся. Прыселіся мы на лавачцы каля дома. Вадзіма цікавілі навінкі з чыгуначнай Чаромхі (апошнім часам кіраўніком поезда працаваў), а мяне — сялянская доля ў прыпушчанскай вёсцы.

— Чым займаешся, — кідаю ў бок гаспадара.

— Грыбочкі збіраю. Чыгуначнай пенсіі малавата.

— А што з гаспадаркай?

— Не аплачваецца ёю займацца. Поле са збожжам і бульбай дзікі знішчаць, а сенажаці і пашу вада затопіць. Бабры развяліся, ад іх паратунку няма. Алешнік правальваюць...

— Не кампенсіруюць затрат?

— Два прашэнні прад’явіў у Ваяводскую ўправу аховы асяроддзя. Трыста злотых прызначылі. Часам паляўнічы гурток нешта прыкіне. Але ўсё ж гэта не пакрые затрат.

Многае яшчэ „пераможвалі” з прыяцелем. З таго, што сказаў Вадзім няма ў вёсцы крамы. Нейкі час гандлем займаўся прадпрымальнік з Чаромхі. Кінуў. Прыбытку не было. Зараз жыхары вёскі карыстаюцца паслугамі аб’язных крамаў. Пункт скупкі малака пакуль што існуе. Сюды пастаўляюць малако жыхары Пяскоў, Забагоння, Доўгага Броду, Пасечнікаў-Малых і Краскаўшчыны. У самым Вітаве нямногія займаюцца жывёлагадоўляй. Вёска заняпадае.



Вадзім Федарук (злева), яго дзядзька Васіль Федарук (усярэдзіне) і Уладзімір Нічыпарук.

— Адны пенсіянеры жывуць, — канстатуе суразмоўца. — Тры пакаленні пенсіянераў зараз маем. З найстарэйшых, што цара-бацюшку памятаюць, нямногія засталіся (пра бежанства мне дзядзька Васіль, Вадзімавага бацькі брат расказваў). Крыху больш можна сямідзесяцігодкаў налічыць, якія міжваенны перыяд запамяталі, ды тых апошніх „выпускнікоў” камуны, якія „пры дэмакратыі” пенсіянерамі сталі. У кожнага з гэтых пенсіянераў свая доля, свае праблемы і клопаты, з якіх можна скласці многасерыйны фільм ці напісаць кніжку.

Уладзімір Сідарук

Фота аўтара

Еўрапеізацыя Пээнэру

Заўсёды пасля 1989 г., калі посткамуністы з СЛД вярталіся да ўлады, іх палітычныя апаненты заяўлялі, што ствараецца ПНР-біс. Малодшым чытачам „Нівы” хачу паясніць, што ПНР гэта скарочаная назва польскай дзяржавы, якая існавала ў 1944-1989 гадах — Польскай Народнай Рэспублікі.

Паводле майго глыбокага перакананння, ПНР ніколі не спыніў свайго існавання, таму што заўсёды вырашальны голас ува ўсіх публічных справах мелі людзі выхаваныя і псіхалагічна сфармаваныя ў тую эпоху, нягледзячы на тое, ці былі яны членамі правячай партыі, ці прадстаўлялі апазіцыйны салідарніцкі лагер. Розніца паміж камуністычнай Польшчай і посткамуністычнай толькі такая, што ў гэтай першай улады прытрымліваліся аднаго са сваіх ідэалагічных прынцыпаў — імкнення да сацыяльнай роўнасці ўсіх грамадзян. У посткамуністычнай — улады прынялі ў гэтай справе псеўдаліберальную дактрыну, якая ў найбольш спрошчанай формуле гучыць: „бяры столькі, колькі здолееш узяць і глядзі толькі, каб цябе за руку не злавілі”.

Такую грамадска-палітычную філасофію пачалі ажыццяўляць яшчэ камуністы пры канцы васьмідзесятых гадоў, пасля салідарнікі яе ўдасканалілі, а каманда Кшаклеўскага і Бузка дапрацавала да абсалютнай дасканаласці. З лібералізмам, капіталізмам ці дэмакратыяй усё, што адбываецца ў Польшчы пасля 1989 г., мае толькі сімвалічную сувязь. Лібералізм — гэта перш за ўсё самаарганізацыя грамадства для вырашэння праблем паасобных людзей, аб’яднаных у гаспадарчых, культурных, палітычных ці грамадскіх арганізацыях. Сучасны лібералізм — гэта пастаянная дыскусія над тым, як знайсці найбольш выгаднае для ўсіх зацікаўленых вырашэнне праблем. Гэта таксама стыль мышлення грамадскіх элітаў наконт таго што зрабіць, каб найбяднейшыя адчувалі сябе багатымі. І найважнейшае — парушэнне закону або агульнапрынятых этычных прынцыпаў палітыкам абазначае канец яго публічнага існавання. Сучасная люмпенізацыя палітычнага жыцця ў Польшчы паказвае толькі на тое, што грамадзяне дачакаліся ў канцы сапраўднай „народнай улады”.

У Польшчы і іншых камуністычных краінах пасля 1989 г. да ўлады прыйшлі людзі, якія фармальна адкідалі ўвесь парадак, які будаваўся дзесяткамі гадоў пры дапамозе жорсткіх палітычных і паліцэйскіх метадаў. Узніклі дзесяткі, а можа і сотні партый. Аднак, калі бліжэй прыгледзецца палітычным элітам, відаць, што амаль усе яны прайшлі праз структуры камуністычнага апарату. Нават калі пазней сталі дысідэнтамі, у сапраўднасці прапанавалі толькі рэфармаванне апарату — інструментаў улады. Будучы пры ўладзе, былыя апазіцыянеры вельмі хутка стварылі механізм, які даў поўны кантроль над публічным жыццём і гаспадаркай краіны для невялікай, амаль закрытай, групы. У час камуністычнай Польшчы група, якая мела прывілеі і адкрытую дарогу да павышэнняў, была нашмат шырэйшай, чым у III Рэчы Паспалітай. Расчараванне зменамі нарадзіла тугу па Пээнэры. Наймалодшае пакаленне посткамуністаў, якое вярнулася да ўлады ў 1993 г., поўнасцю адобрыла рэформу сістэмы, якую правялі салідарнікі. Маючы падрыхтаваныя кадры, перанялі кантроль над банкаўскай сістэмай, манапалістычнымі фірмамі і тэлебачаннем.

Прыватызацыя, якая мела стварыць падставы капіталістычнай фармацыі, стала формулай прысвойвання маёмасці людзьмі эліты ўлады. Пасля 1989 г. раптам узнікла група алігархаў, якая атрымала маёмасць, нічым не рызыкуючы, не ўносячы ніякага ўласнага капіталу. Найбольш актыўныя грамадзяне, якія паверылі ў свабоду гаспадарчай дзейнасці і рыначную гаспадарку, хутка зарыентаваліся, што без падтрымкі нейкага палітычнага клана якая-небудзь актыўнасць раней ці пазней вядзе да банкруцтва. Карупцыя стала амаль фармальным элементам публічнага жыцця, а палітыка найбольш прыбытковай формай публічнай актыўнасці. Сапраўднае спаборніцтва паміж партыямі звялося да змагання за наглядальныя рады і ўправы дзяржаўных манапалістычных фірмаў.

Лакальныя царыкі атрымалі самаўрады, якія аднак не мелі нічога супольнага з самаўрадамі ў ліберальных сістэмах. На Захадзе бывае так, што дзесяцімільённы горад мае самаўрад з 12-14 чалавек. У трохсоттысячным Беластоку райцаў паўсотні. На Захадзе гэта ў большасці людзі з вялікім дасведчаннем, аўтарытэтам і дасягненнямі. У нас — лепш не ўспамінаць. У Беластоку да 1990 г. Гарадская ўправа памяшчалася ў камяніцы пры вуліцы Браніцкага. Сёння займае тую самую камяніцу, 16-павярховы будынак пры вуліцы Слонімскай, а ў планах пабудова новых палацаў для мясцовых царыкаў. У горадзе, у якім абанкруціліся амаль усе прадпрыемствы, найбольшым працадаўцам стала гмінная адміністрацыя. Не цяжка здагадацца, што выпадковых людзей у ёй не бывае. Раней сімвалам Пээнэру былі камітэты партыі. Разам з дзяржаўнай адміністрацыяй стваралі яны аднак у тры разы меншую армію бюракратаў чым цяпер. Нават найлепш развітая гаспадарка не вытрымала б такой колькасці беззямельнай шляхты.

Дэмаралізацыя палітычных і грамадскіх элітаў вельмі хутка прывяла працоўны і беспрацоўны люд у стан пачуцця безнадзейнасці. Такая псіхалагічная сітуацыя была пры канцы семідзесятых гадоў, але тады яшчэ існавалі аўтарытэты і вера, што можна збудаваць іншы свет без хлуслівых і скарумпаваных палітыкаў, справядлівы эканамічны і палітычны парадак. Была надзея. Сёння няма нічога і нічога немагчыма прадбачыць. Фрустраваны люд гатовы аддаць уладу новаму Пілсудскаму або Мусаліні. Відаць нават даволі выразна кандыдатаў на фюрэра нацыі. Альтэрнатывай для нацыяналістычнай дыктатуры з’яўляецца толькі Еўрасаюз. Постпээнэраўскія эліты цягнуць Польшчу ў Еўропу і хаця гэта правільны напрамак, аднак рэалізацыя еўрапеізацыі праводзіцца прыблізна ў такім жа стылі, як усе ранейшыя рэформы. Выніку сучаснага змагання еўрапейцаў і антыеўрапейцаў немагчыма прадбачыць. Адно толькі пэўнае — усім беларусам і беларусападобенцам найлепш было б, каб гэты Пээнэр далучылі да Еўропы. У ёй ёсць яшчэ нейкая перспектыва найменшым пакаленням.

Яўген Мірановіч

Вачыма паляка

Шуканне ўткоў

Атрымалася так, што дзякуючы беларусам з беларускай рэспублікі жыхарам Польшчы лепш жывецца. Згодна з тым, што падало тэлебачанне Польсат за данымі Галоўнай статыстычнай установы, гэта якраз яны ў апошні час выдаюць у нашай краіне найбольш долараў, больш, чым багатыя немцы. Гэта інфармацыя дайшла да мяне, паколькі я чамусьці ў апошні час пільна сачыў за тэлебачаннем, можа, таму, што зрабілася халадней, а самому мне няма чаго выдаваць, дык няма чаго цягацца па месцах, у якія без граша не зойдзеш. Я браў пілот і скакаў па праграмах. Шукаў чагосьці пра Беларусь, беларусаў, беларушчыну. І нічога! Праўда, пачуў ды пабачыў там шмат цікавага ды дурнаватага. Але ж амаль нічога, апроч даных ГСУ у Польсаце, з таго, што мне хацелася.

Штосьці гаварылі аб вяртанні расійскай ідэі пабудовы калідора з Калінінградскай вобласці праз Польшчу і Беларусь, ды гэта ў кантэксце адносін Польшча-Расія. Геаграфічна найбліжэй да цікавай мне Беларусі было ў тэме могільніка Арлянят у Львове, праблему якога Марэк Сівец, шэф нацыянальнай бяспекі ў Канцылярыі прэзідэнта Кваснеўскага акрэсліў „могільнікавай дыпламатыяй”. І, пакуль што, справу пахавалі. Так, вось, я скакаў па каналах як заяц па полі. Натрапіў на парламентарныя выбары ў Галандыі, якія праводзіліся ў сераду, а не ў нядзелю, як у Польшчы ды ў шмат якіх іншых краінах. На мясцовай станцыі паглядзеў я справаздачу з Кубка Польшчы ў пляжным мячы, які праводзіўся ў... Гайнаўцы. У гайнаўскі амфітэатр спецыяльна на тую імпрэзу навезлі дзесяткі тон пяску. Ну, дык гэта, пэўна, у рамках працягвання марскіх традыцый Гайнаўкі (прыгадваецца ідэя ўтварэння тут марское школы). Урэшце, з увагай выслухаў я вулічнае апытанне ў рэгіянальнай „тройцы”, прысвечанае чытальніцтву ў Польшчы, праведзенае з нагоды Міжнародных кірмашоў кнігі ў Варшаве. Адна пажылая жанчына, якую запыталі, ці, на яе думку, палякі чытаюць, пераканаўча адказала: *Kto lubiał książki, ten będzie lubiał. Kto nie lubiał, nie będzie lubiał. Nawet diabeł nie zmusi tego, co nie lubiał, żeby lubiał.* А так, калі ўспамінаць тэлевізійныя справаздачы, ні слова мы не пачулі аб тым, што госцем кірмашоў быў знакаміты беларускі пісьменнік Ігар Бабкоў. Затое амаль кожная станцыя паказвала і гаварыла аб ібера-амерыканскай зорцы сучаснай літаратуры Карласе Фуэнтэсе.

Аднойчы ў ваколіцы паабедняга „Вялікага брата” я не стрываў. Выйшаў, аднак, у горад, пашукаць „беларускіх тэмаў”. На Суражскай натрапіў на моладзь, якая маніфеставала, на варшаўскі ўзор, свае праеўрапейскія сімпатыі. Спявалі, махалі сцягамі, а гледачоў можна было палічыць на пальцах аднае рукі. Нуда. Нават віцэ-прэзідэнт Беластока дыпламатычна змыўся. Зразумела, не магло быць тут і гаворкі пра беларускі ўток. Урэшце, Беларусь жа ж мае застацца з таго боку муру, хоць гэтае слова ніхто афіцыйна не ўжывае. Так як апасаецца ўжываць слова „калідор” у кантэксце шашы хуткага руху з Калінінградскай вобласці. Аддаляючыся ад Суражскай, на рэкламным слупе я ўбачыў, як адзін з плакатаў запрашае на першы ў Беластоку мюзікл, рэалізаваны на базе мясцовай паэзіі. Ды няма там хоць аднаго вершыка нашых беларусаў. Тады ўжо, зусім злосны, пайшоў я шукаць беларускія ўткі ў „Ніву” (без грошай не мог я нават заглянуць ва ўлюбёную кавярню М.). І так, вось, напісаў я гэты тэкст. Пачынаючы ад грошай, якія пакідаюць у Польшчы беларусы. Галоднаму паляку хлеб на думцы, не што іншае.

Мацей Халадоўскі

Экзамен на атэстат сталасці ў гайнаўскім белліцэі

Сёлета да экзамену на атэстат сталасці ў Комплексе школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы прыступіла 137 асоб, з пяці чацвёртых класаў. З пісьмовага і вуснага экзаменаў былі звольнены ўдзельнікі Алімпіяды беларускай мовы — восем чалавек. Ім — лаўрэатам і фіналістам Алімпіяды — з пісьмовага і вуснага экзаменаў па беларускай мове паставілі шасцёркі.

Больш за 50 абітурыентаў пісала на тэму „Пра маці можна гаварыць бясконца. Роля маці ў жыцці кожнага чалавека і яе постаць у вядомых табе творах мастацкай літаратуры”. Тры іншыя тэмы: „Кожны народ не без роду і племя і мае летапіс свой і гісторыі след на старонках (Мікола Гусоўскі). Раскажы пра выбраныя табою старонкі беларускай літаратуры, якія адлюстроўваюць гісторыю і жыццё беларускага народа”, „Праблема чалавечага шчасця і сэнсу жыцця ў творчасці беларускіх пісьменнікаў і паэтаў” ды „Выкажы свае думкі і рэфлексіі пасля знаёмства з вершам Міхася Стральцова „Жыццё, жыццё” пісалі па 25-27 асоб. Рыхтавалі вучняў да экзаменаў настаўніцы Іаланта Грыгарук і Вольга Сянкевіч.

— Вучні чацвёртых класаў ліцэя вырашылі здаваць экзамены на атэстат сталасці па-старому, як і ў папярэднія гады, хаця ў другім і трэцім класах рыхтаваліся да так званай новай матуры.

І так, пісьмовыя працы напісалі добра, а нават вельмі добра. Паказалі вельмі арыгінальныя думкі, свой уласны погляд. Пісалі аб сабе. Асабліва юнакі. Я была імі захопленая, — сказала настаўніца Іаланта Грыгарук. — Што так будзе, я не сумнявалася: відаць гэта было як чацвёртыя класы пачалі больш увагі прысвячаць урокам беларускай мовы.

Гутарылі мы і пра тое, дзе выпускнікі гайнаўскага белліцэя пойдуць вучыцца далей. Аказваецца, што нават тыя з шасцёркай па беларускай мове не пойдуць штудзіраваць у вышэйшыя навучальныя ўстановы ў Беларусі. Будуць прадаўжаць навуку бліжэй дому, напрыклад, у Беластоку, ды на тых спецыяльнасцях, пасля заканчэння якіх лягчэй будзе знайсці сабе працу. Ёсць ахвотныя здаваць экзамены ў медыцынскую акадэмію, ва універсітэт (на паланістыку ды гуманістычныя спецыяльнасці), у політэхнічны інстытут.

Экзамены на атэстат сталасці закончацца 29 мая. Трэба будзе развітацца з ліцэем, як кажуць навучэнцы, са сваёй „будай”. Але не забудуць яны праведзеных тут сваіх юных гадоў, мо нават самых прыгожых у жыцці. А ўжо напэўна, што я даведаўся ў сакрэце, не забудуць тае цудоўнае атмасферы, якая панує ў белліцэі, сваіх настаўнікаў.

Янка Целушэцкі

Літаратурна-мастацкая старонка (506)

Дотык

Фірма „Дотык” нарадзілася за кантовым столікам, які папраўдзе быў кравецкай машынай маркі „Singer”, на нажную педаль. Было ўжо пасля поўначы і мы думалі, як зарабіць першы мільён долараў. Валеры Ян Шчодры ўзнёс левую руку і дакрануўся да носіка Дамінкі.

— Гэтымі рукамі! — ён паказаў адну, а пасля другую далоні.

Я і Дамінка згодна падтакнулі — мы ўсё жыццё марылі, каб жыць з чарадзейства.

* * *

— Ты будзеш адказнай за рэкламу, — Валеры Ян зноў узняў левую руку, вылучыў указальны палец і тыцнуў ім у бок Дамінкі.

— Што? — пачырванела будучы апостал фірмы і, хлябнуўшы са шклянкі піва, на знак згоды і ўдзячнасці, напісала верш (на папяровай сурветцы) пад загалоўкам „Валеры Ян”. Менавіта тады пачаўся славуты паэтычны цыкл „Мясцовыя”, у якім у першую чаргу расслаўлены першыя фігуры нашай суполкі, гэта значыць я і Валеры Ян, ды ўсе патэнцыяльныя пацыенты фірмы „Дотык”.

— А ты будзеш бухгалтаркай! — В.Я.Ш. узняў указальны палец і пацэліў у мой нос. Я цяжка ўздыхнула і падумала, што маю дурное шчасце — зноў сустрэла дурнейшага за сябе. Вось даручылі мне, старой клептаманцы і махлярцы, лічыць грошы з божае ласкі!

— Я-я-я ж... абкраду вас. І ўцяку... з касай на трапічныя астравы, пад нейкія пальмы... — я пыкала і баранілася.

Прэзідэнт Валеры Ян маўчаў як пень.

— Будзеш бухгалтаркай! — ён харызматычна паўтарыў, і я зразумела, што ў мяне няма выхаду.

* * *

Цяпер я лічу, што такое 13 лютага 2000 года нас „прывяло” за кантовы столік-машыну, на нажную педаль. Як салідны і сумленны бухгалтар фірмы „Дотык”, я вінавата чытачу мерытарычную справаздачу. Тым больш, што ў Беластоку і наваколлі намножылася процьма недарэчных легенд і казак пра нашу суполку...

Мы сустрэліся выпадкова, як людзі — у начным спажывецкім магазіне „Дэлікатэсы”. Пасля кіслага піва ў кафэ-бары М. нам захацелася есці. За апошнія грошы мы купілі трыста грамаў пшанічна-бульбяных капыцікаў, якія мела сасмажыць на вячэру-снеданне Д.

Набліжалася поўнач. У пэўны момант, між прылаўкамі, мы згледзелі знаёмае мядзведзішча. Дамінка ведала Валерыка яшчэ са студэнцкіх часоў. Яна любіла сварыцца з ім за спадчыну Вялікага княства Літоўскага, у канкрэтнасці за смаленскія палкі.

— Салют! — зачапілі мы сумнага барадача.

— Салют! — адказаў нам Валеры Ян Шчодры і зразу прапанаваў нам пайсці ў кафэ-бар „Кастэль” папіць піва. Мы дадумаліся, што ў Валерыка на сэрцы праблемы. Дамінка і я ў пэўным сэнсе жанчыны-міраносіцы, і мы не мелі іншага выхаду, як дапамагчы трагічна закаханаму калегу.

* * *

У маім „Аранжавым дзённіку” пазначаны ўсе хвіліны нашай ініцыяцыйнай сустрэчы. Вам, шаноўныя, распавяду пра найважнейшае:

Пасля таго, як мы ахрысцілі фірму, Валеры Ян, замест балбатаць, устаў з-за машыны-століка і рушыў па піва. Мы сёрбалі „Зубра” і адчувалі сябе як на хрысцінах у сёмым небе. Запой у кафэ-бары „Кастэль”, дзе завязалася наша легендарная суполка, справа тэрапеўтычная. Пасля поўначы тут праседжваюць выключна адны паклоннікі прынцыпу: „Малы недапой — хужэ вялікага перапою”! Горш, калі ты галодны і хочаш паесці, напрыклад, дастанеш са сваёй сумкі хатні бутэрброд (у нашым выпадку капыцікі). Тады падыдзе строгі бармен, пачастуе цябе аплявухай і забярэ харч.

У гэту ноч было інакш. За нашым столікам-машынай, паміж півам і пшанічна-бульбянымі капыцікамі, якія мы глыталі на вачах бармена, кроіўся бізнес-план!

— Я буду чытаць з рукі лёс, — заявіла Дамінка.

— А я будзіць і ўсыпляць рыцараў, — не адставала я.

— А я даіць зачараваных кароў, — перабіла Д.

— А я даводзіць да банкруцтва паршывых бізнесоўцаў, што не спрыяюць нашай справе, — не здавалася я.

— А я абдуваць іх з таленту і моцы, — зноў перабіла Д.

— А я амалоджваць, — тусавалася я.

— А я зводзіць з дурнога розуму, — дакінула Д.

Наш прэзідэнт не сцярпеў бабскага бязглуздага сокату, харызматычна ўзняў левую руку, і мы змоўклі. Бо Дамінка вычытала з рукі Шэфа, што расшыфрэчваем код фірмы.

* * *

Каб забяспечыць тайны нашае фірмы, Валеры Ян Шчодры заняўся найперш апосталам.

— Ці адчуваеш маю моц? — ён яшчэ раз дакрануўся да галавы Дамінкі.

— Адчуваю тваю моц, — адказала спалохана Д. і мігам напісала другі верш. Верш пра нашу фірму, вядома, — гэтым разам пра мяне: „Агатка — наша хросная матка”.

Пасля залатыя рукі шэфа ўзлажыліся на маю галаву і я адчула, што ў мяне памяняўся розум.

— Я лічу, што толькі наша тройца мае жыццятворную моц, — сказала ваша бухгалтарка і мне падтакнулі. Мы зразумелі, што няма нам жыцця без сябе і нашае фірмы. Цяпер, калі слава фірмы на міжнароднай арбіце і да нас дабіваюцца рукамі і нагамі, мы кажам — п-с-і-к! — навічкам. Мы сцеражэм нашу боскую трыадзіную постаць.

* * *

Наш ідал праліў кроў за нас ужо ў першы дзень. Дарэчы, ніхто з даследчыкаў нашае місіі не паставіў фундаментальнага пытання: „Як разышліся ў той дзень фігуры фірмы «Дотык»”? Якраз тут загваздка ў рытуальным сэнсе!

Было менавіта так: у пяць гадзін раніцы я і Дамінка пазычылі ў Шэфа грошы і як паважаныя працаўніцы фірмы „Дотык” раз’ехаліся на таксі кожная ў свой бок. Наш прэзідэнт астаўся верны прынцыпу кафэ-бара „Кастэль” (пасля поўначы).

Ужо раніцай мы прачыталі ў лакальнай прэсе пра нашу фірму. Інфармацыі, падлітыя калюжынай крыві, знаходзіліся ў найбольш папулярнай рубрыцы „Крымінальныя навіны”:

„Сёння, каля шостай раніцы, паліцыя інтэрвеніявала ў кафэ-бары „Кастэль”. Сярод ахвяр крывавай сутычкі найшоўся вядомы кіраўнік камп’ютэрнай суполкі „S.O.S” Валеры Ян Ш. Паводле ўступных допытаў вядома, што гэта ён выклікаў спрэчку, гаварыў Цэзару К. і Эмілю Д., „że jest jakimś prezesem i musi dotykać”. Згаданы Цэзар К. (16 гадоў) і Эміль Д. (11 гадоў) палічылі прапанову В.Я.Ш. (38 гадоў) праявай сексуальнага дамагання і ў адчаі кінулі шклянкай з півам „Зубр” у твар нахабу. За ахвярамі правакацыі заступіліся бармен і трох падвыпіўшых фанатаў футбольнай каманды „Ягелонія”. Пасля, калі акрываўлены камп’ютэршчык схаваўся пад стол, яны пачалі біць адзін аднаго. У выніку бойкі фанату „Ягелоніі” выбілі зуб. Шкоды ацэнены на пяцьсот злотых. Сам падрыўнік, пан В.Я.Ш. мае разбіты нос і ў яго назіраюцца псіхічныя анамаліі — ён на кожнае пытанне заяўляе: „«Дотык» з вамі палічыцца!”

* * *

Не хвалюйцеся, шаноўныя. Скажу вам у сакрэце — гэта наш прэзідэнт быў ініцыятарам і аўтарам першай рэкламы ў прэсе. І мы не з’ядаем дарам харч: дзейнічаем, спяваем, лічым, прыбіраем. А каму гэта не падабаецца — хай піша скаргу кіраўніку кіно „Сірэна” (у мінулым там працавалі масонская ложа і рэдакцыя „Нівы”). Менавіта, наша місія ёсць толькі сляпой паслядоўнасцю ад фільма „Догма”, які я і Дамінка агледзелі ў пятніцу, 13 лютага 2000 г., гадзіну да сустрэчы з Шэфам.

І яшчэ адно — мне смешна, калі вы пляткуеце пра нашага прэзідэнта Валеры Шчодрага — што быццам бы спіць ён на кучы грошай. Не, шаноўныя — ён спіць на аранжавай канапе (без посцілкі), — гэта праверылі я і Дамінка, і вам сумленна заяўляем.

Ганна Кандрацюк

Міра Лукша

* * *

прахвост прахвастае
апошнюю капейку
што далі яму ў крэдыт даверліва
выбаршчыкі
выбіралі боршч бо лепш боршч
чым нічога
суп з нічога
ні бога
ні дарога

у свет прахвоста пусцілі
заспявалі як перад войскам
пашкадавалі што наш добры хлопец
а старацца трэ а сярод людзей
то нашага з’ядуць
бо наша заўсёды дый прападала
але цяпер нас многа
манну чакае нябесную
а калі яна будзе а
то бог не даў
бо бог па-нашаму не ўмее
разумець
ай аплёўваюць зноў аплёўваюць
сабе ў бараду плююць
а прахвост — у гальштуку —
у гальштук
што зноў звалакуць з трыбуны

* * *

трактарысту добра
пахне саляркай конь ягоны
і не рвецца воч не выпучвае
на авёс як лёс
геркаўскі той яшчэ трактар
бацькаў

на забаве вясковай
пэрхае за святліцай
ненаравіцца яму наравістаму
што опелі млявыя вольвы
(лупу паломіш!)
гольфы і гонды
дзяўчат паразбіралі
і ў горад

* * *

Як зачыненыя дзверы
зачыняеца душа.
А калія няма даверу,
петляй уецца просты шлях.
Дотык добрае далоні
холадам марозіць сон.
Мы сябе ўжо не дагонім
пасярод начэй і дзён.

Уладзімір Саўчук

Вечны стораж

Вецер сеяўшы зярно
даў пачатак Божай волі
калі вырасла ў гады
дуб шуміць у шчырым полі

дождж абмыў блакітны ўзгорак
напаіў да сыта злогі
і цяпер у адзіноце
стараж уе ён дарогі

Развага

Цяжка сёння браць намер
на жыццёвыя падзеі
дзе падатак вяжа рукі
і шматлікія надзеі

Юрый Баена

* * *

Трэба ўсё пачынаць ад сябе:
ад праўды цвёрдай як камень,
ад агню і вады,
ад ран, якія гояць раны,
ад слоў каяння і прабачэння,
ад заўтра — тваё заўтра сёння...

Каб бяссільнае было зло,
трэба шмат дабрыні.

Любоў, як святло, увойдзе самая,
калі дзверы пакінем адкрытыя
на справы жывыя,
чалавечыя,
бессмяротныя, святыя.

Віктар Швед

Дзве касы

Да маёй 77 гадавіны з дня нараджэння

Паўсюдна чую галасы:
— Табе ж ужо семдзесят сёмы!
А я кажу, што дзве касы
Стаяць каля мяне, вядома.

Дык трэба верыць у свой лёс,
У перамогу сваю веру.
Калі запас я маю кос —
Магу быць грозным касінерам.

І калі б гэтая з касой
Прыйсці хацела нечакана,
Будзе мець ад мяне адбой —
Яшчэ ж зарана, ой, зарана.

Зорка

старонка для дзяцей

„Бывае гори" — тэатр з ПШ н-р 4 у Беластоку.

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Вершы Віктара Шведа

Знайшла выхад

Хлопец надта нешчаслівы,
Мучаць хатнія сакрэты.
Выйшаў бацька за алівай —
Не вярнуўся ён дагэтуль.

— А што робіць твая мама? —
Запыталі хлопцы мальца.
— Не чакае бацькі з крамы —
Смажыць дранікі на шмальцы.

Дзіцячыя мары

Бацьку лысага ў міжчасе
Запытаў малы Макар:
— Ці табе ў жыцці збылася
Хоць адна з дзіцячых мар?

— Галаву мне мыла мама —
Праклінаў тады свой лёс,
Ну і марыў я таксама,
Каб зусім не мець валос.

Вясна

Цікавая пара
Гэта наша вясна
Прырода ажывае
Птушка спявае
Часта дожджык ідзе
І трава расце
Птушкі гнёзды будуюць
Людзі цяжка працуюць

Раман Лушчынскі, V „б" кл.
ПШ н-р 3 у Бельску-Падляшскім

Гняздо чорнага бусла

Дуброва сустрэла таямнічай цішынёй і спакоем. Навокал — магутныя дубы. Недзе тут, на адным з іх, гняздо чорнага бусла.

Пачынаю пошукі. Хаджу ад аднаго дуба да другога, углядаюся ў вершаліны. Ажно шыя забалела ад напружання.

Аглядаю вершаліну чарговага дуба. На двух тоўстых бакавых суках бачу вялізнае гняздо.

Аб тым, каб узлезці і глянуць, што ў ім ёсць, і думаць няма чаго. Да самага гнязда на ствале ніводнага сучка. Дрэва тоўстае — рукамі не абхопіш.

Дол пад дубамі нібыта вапнай пабелены. Значыць, птушкі тут жывуць. Гадаю, што ў гняздзе: яйкі наседжваюцца ці птушаняты ўжо ёсць. А мо вывеліся і паляцелі. Прымаю рашэнне чакаць непадалёку і назіраць: мо прыляціць стары бусел, і тады ўсё высветліцца.

Марудна цягнецца час. Старыя буслы чамусьці не прылятаюць. У галаве мроіцца непрыемная думка:

„Спазніўся, відаць, паляцелі буслы".

Метраў за дзесяць ад дуба з бусліным гняздом стаіць танчэйшы дубок. Вершаліна ў яго ўзнімаецца крыху вышэй гнязда буслоў. „Трэба залезці на гэты дубок, — думаю я, — і адтуль зазірнуць у гняздо".

З непрывычкі лезці на дрэва вельмі цяжка. Тым больш што галін на гэтым дубе знізу таксама няма. Але жаданне ўбачыць буслянят перамагае. Ледзьве дабраўся да вершаліны. Рукі і ногі дрыжаць. У роце горка.

Але пра ўсё я забыўся, калі глянуў у гняздо.

Двое чорных вялікіх буслянят з сіваватымі палосамі нявылінелага яшчэ на спінах пуху прыціснуліся адно да аднаго і ляжаць у гняздзе як нежывыя. Прытаіліся. Асцярожныя.

Злезшы з дрэва, я ад стомленасці падаю на сухое дубовае лісце. Рукі і ногі паабдзіраў. Доўга яшчэ ляжу, адпачываю. Бусляняты не ўстаюць на ногі. Толькі адно высунула дзюбу з гнязда, убачыла мяне і зноў схавалася.

Над дубамі з'явіўся стары чорны бусел. Ён зрабіў толькі адзін круг над дубам, на якім было гняздо, і паляцеў. Магчыма, заўважыў мяне, а мо толькі праверыў, ці на месцы яго дзеці.

Назаўтра зноў іду да чорных буслоў.

Пад суседнім дубам паставіў невялікі буданчык з маладога арэшніку. Шырокае лісце добра хавае мяне.

Буслянят не відаць — ляжаць у гняздзе. Старых птушак таксама няма.

Заядаюць камары. Сляпіцаю лезуць у вочы. А ў гняздзе, як і раней, ніякіх прыкмет жыцця.

Седзячы ў буданчыку, успамінаю скупыя звесткі пра чорных буслоў. Птушкі гэтыя выключна лясныя. Гнёзды робяць на ўчастках лісцевага і мяшанага лесу. Выводзяць двоепяцёра птушанят. Кормяцца жабамі, вужамі, дробнай рыбай. Адлятаюць чорныя буслы ў вырай у канцы жніўня і напачатку верасня.

Белых буслоў нельга ўявіць без чалавечага жылля. І наадварот — там, дзе жывуць людзі, чорныя буслы не вядуцца.

Таямнічая птушка — чорны бусел. Таямнічае яго жыццё.

Змітрок БЯСПАЛЫ

Польска-беларуская крыжаванка № 22

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 18: Кадаўб, лапа, канапа, вандроўка, уздым, удача, сады, Ас, таката. Вудка, паказ, пандус, кандыдат, армада, пончык, аўта, баравіна.

Узнагароды, **запісныя кніжкі**, выйгралі: **Наталля Герасімюк** і **Марта Кузыка** з Махнатага, **Паўля Вітальеў** з Орлі, **Анджэліка Сельвесюк** з Бельска-Падляшскага. Віншуем!



Эвеліна Вышкоўская („Вожык”) з Аўгустова.

Тэатр і ўзнагароды

На „Сцэнічнае слова”, якое 11 мая г.г. адбылося ў Кляшчэлях, прыехала дзевяць калектываў. Тэатральны агляд праходзіў у мясцовай школе. Мерапрыемства, традыцыйна ўжо, арганізавала Беларускае грамадска-культурнае таварыства, а суарганізатарамі былі згаданая школа і мясцовы дом культуры.

— Мы рады, што наш агляд патрэбны вучням, што, дзякуючы нашай ініцыятыве, дзеці і моладзь развіваюць свой талент, — адзначыла Тамара Русачык, старшыня камісіі.

„Як люстасць стала літасцю” — тэатр з Орлі.

Праўда, сярод выступаючых паказаліся таленавітыя акцёры. Цяжка пералічыць усіх, аднак, самыя яркія індывідуальнасці прыехалі з ПШ н-р 4 у Беластоку. Сярод выхаванкаў Аліны Ваўранюк, якая, дарэчы, сама з’яўляецца класнай акцёркай і рэжысёрам, можна пералічыць з дзесяць асоб. Узнагароду для найлепшага інструктара камісія прызначыла менавіта Аліне Ваўранюк з Беластока. Іх спектакль „Бывае горш” заняў першае месца!

Першае месца і ўзнагароду бурмістра горада Кляшчэлі атрымаў лялечны тэатр з Вясковага дома культуры ў Рыбалах, які працуе пад кіраўніцтвам Лідзіі Мартынюк. Самадзейнікі з Рыбалаў паказалі два спектаклі: спектакль у катэгорыі жывога плана — „Першыя крокі самастойнасці” і лялечны спектакль паводле народнай казкі „Гарошак”.

Сярод выканаўцаў вылучаліся гаспадары — вучні з Кляшчэль. Пад кіраўніцтвам Ірэны Тамашук яны падрыхтавалі пастаноўку „Усміхнікі, прынцэса”. Тэатр з Кляшчэль заваяваў другое месца.

Непаўторна паказаўся тэатр з Аўгустова, які працуе пад кірункам Ірэны Хадакоўскай. Аўгустова вылучылася касцюмамі ды сцэнічным афармленнем і ім прысвоілі трэцяе месца.

Орля вылучылася падборкай рэпертуару (атрымалі два вылучэнні), у канкрэтнасці, гімназісты разважалі праблему граматыкі і падыходу да роднай мовы. Іх спектакль „Маскарад часцін мовы” павучальны. Здаецца, аднак, што лепш падыходзіць ён для камернай публікі, чым на агляд тэатраў, дзе, каб заваяваць увагу гледача, неабходны моцны эфект. Варта адзначыць, што ў гэтым плане вылучаўся другі спектакль навучэнцаў ПШ н-р 4 у Беластоку „Вадзіцельскія правы”.

Камісія (Тамара Русачык, Яніна Плютовіч, Мар’я Клімовіч) вылучыла найлепшых акцёраў. Сярод іх апынуліся:

— Крыстыян Бурнос з Рыбалаў,

— Наталля Кандрацюк-Свярубская з Беластока,

— Эвеліна Вышкоўская з Аўгустова,

— Магдаліна Лемеш з Орлі,

— Анэта Леанкевіч і Марта Наскевіч з Кляшчэль.

На жаль, не прызнана была ўзнагарода за аўтарскі сцэнарый і апрацоўку класічных твораў, а таксама за сцэнічнае афармленне і музыку. У гэтым плане, паводле ніжэйпадпісанай, найцікавей паказалася Аўгустова.

Зорка

Фота Ганны Кандрацюк

Лідзія Мартынюк і яе выхаванцы з Вясковага дома культуры ў Рыбалах.

„Усміхніся, прынцэса” — тэатр з Кляшчэль.

Публіка заварожаная чароўнай пастаноўкай.

Новыя гісторыі дзядзькі Сіда Рука

Як маленькі хлопчык знайшоў стрэльбу, ды ледзь не распачаў вялікую вайну з НАТО

Аднойчы вечарам маленькаму хлопчыку Янку не было чым заняцца. Тады ён залез у спіжарню, грунтоўна пакорпаўся ў старых рэчах, што даўно пакрыліся пылам ды павуціннем, ды раптам знайшоў бацькаву стрэльбу, на якую галоўны сямейца забыўся яшчэ тады, калі сам, можна сказаць, быў крыху бальшэйшы за свайго маленькага сынка Янка. І вось цяпер гэты самы сынок надзейна зацiснуў бацькаву стрэльбу ў сваіх не надта яшчэ крэпкіх руках, вылез на двор ды хацеў драбабохнуць адразу з двух руляў па дурной вароне, што села нахабаю на страху іхняй хаты. І стрэльба-такі добра гахнула, аднак, калі вы падумалі, што зарадам адарвала крылле ці яшчэ што дурной вароне, дык падумалі вы так дарма, бо пацэліў выбітны маленькі стралок зусім не па вароне, а па вялікаму ваеннаму самалёту, што якраз пралятаў над іхняй хатаю. Самалёт, ясная рэч, страшна загарэўся ды пачаў валіцца на бліжні лес, служба варожае выведкі адразу зафіксавала гэты абуральны факт у сваіх сакрэтных данясеннях, данясенні паляцелі ў штаб-кватэру НАТО, а ўжо адтуль беззаганныя генералы аддалі катэгарычны загад распляжыць ушчэнт авіяцыйнымі бомбамі тую самую краіну, у якой жыў наш маленечкі хлопчык Янка. І гэтак сталася б, і была б ужо вялікая бяда і гора, каб не прыбег з работы Янкаў бацька ды тэрмінова не затэлефанаваў у Брусель у штаб-кватэру НАТО найгалоўнейшаму генералу — свайму сяброву-аднакласніку, каб той татальную бамбоўку ўсё ж адмяніў. За гэта Янкаў бацька абяцаў адкупіць з чарговае палучкі для НАТО новы самалёт, а са сваім малым падшываццам разабрацца па-мужчынску — гэта значыць, з добрай лупцоўкаю бярозавым прутам.

Так што, шаноўныя хлопчыкі, калі вы адныя застаецеся дома і вам няма чым заняцца, лепей усё ж не даставайце бацькавыя старыя стрэльбы з камораў — а то яшчэ, не давядзі Божа, распачнецца трэцяя сусветная вайна!

Марыя Бабулевіч (стаіць на апошнім плане) з вучнямі ў час мастацкіх заняткаў.

Адкрытыя заняткі ў БДК

У Бельскім доме культуры дзейнічаюць пастаянныя гурткі зацікаўленняў. Моладзь прымае ўдзел у мастацкіх, музычных, тэатральных і танцавальных занятках.

У гэтым годзе былі арганізаваны адкрытыя тэатральныя заняткі. Дзеці знаёміліся са сцэнай і прыладамі, якія выкарыстоўваюцца ў час спектакляў.

— Магчыма, што некаторыя з гэтых дзетак у будучыні папоўняць наш тэатральны калектыў і самі будуць выступаць на сцэне, — сказала Альжбета Фіёнік, апякун тэатральных заняткаў.

Апошнім часам удзельнікі тэатральнага гуртка выступалі з пастаноўкай „Вяселле", падрыхтавалі тэатральныя мантажы да „Дня зямлі" і змагаліся ў конкурсе „Роднае слова" (пераможцамі сталі Агата Смактуновіч, Юлія Дораш і Юліта Шчурак).

У час мастацкіх спатканняў, якія вядзе Марыя Бабулевіч, вучні малююць і рысуюць. Перад Велікодным святам размалёўвалі яйкі. Апошнім часам тэмай прац былі вясеннія краявіды. Моладзь выконвала нацюрморты і лінарыты. У вясеннім конкурсе, арганізаваным БДК, перамаглі сем вучняў з бельскай „тройкі": Юстына Перавой, Марта Янчук, Мартына Валерыян, Дамініка Дэц, Наталля Лаўранюк, Дам'ян Татарчук і Бартламей Дэц. Марта Бабулевіч атрымала ўзнагароду на Ваяводскім аглядзе абрадавых прыкладных мастацтваў у Моньках.

У БДК пад наглядам Юстыны Пажазінскай арганізаваны былі адкрытыя музычныя заняткі. Дзеткі развучалі песні, знаёміліся з музычнымі інструментамі і прымалі ўдзел у занятках па рытміцы. У час танцавальных заняткаў з Анджэем Кшыўцам моладзь вывучала сучасныя танцы.

— Штогод стараемся арганізаваць у БДК нешта новае. Хочам, каб як найбольш дзяцей і моладзі ўдзельнічала ў арганізаваных намі занятках. Некаторыя спатканні стараемся арганізаваць у форме гульняў з узнагародамі, — паінфармавала Яніна Плютовіч, кіраўнік аддзялення мастацкай адукацыі ў БДК.

Аляксей Мароз

Фота аўтара

Фільмавы вечар

У гэтым тыдні прапаную тры фільмы, на якія варта прысвяціць адзін з вясенніх вечароў і разам з кімсьці блізкім пасядзець перад блакітным экранам.

„Мыс страху" рэжысёра Марціна Скарсэзэ і з адборнай камандай акцёраў у галоўных ролях (Нік Нолці, Робэрт Дэніра, Джэсіка Ланг, Роберт Мічум і Грэгары Пэк) прыцягвае нашу ўвагу, хаця гэта карціна дзесяцігадовай даўнасці. Аднак не ўсе мелі магчымасць паглядзець гэты фільм, а нават калі было інакш, варта пазычыць відэакасету і перажыць яшчэ раз хвіліны страху.

Псіхапат, пакрыўджаны калісьці адвакатам, пасля выхаду з турмы, хоча адпомсціць свае крыўды. Акружае сям'ю адваката і прымушае іх да ўцёкаў у пустую хату на мысе, а там, у час вялікай навальніцы адбываецца жудаснае заканчэнне драмы. Вялікія зоркі галівудскага кіно, як і дрыжыкі страху ад музыкі Элмера Бернстэйна запэўняць вялікія эмоцыі!

„Сабакі і каты" Лоранса Гутэрмана — гэта камедыя для ўсёй сям'і, а ў асаблівасці для дзяцей з моцнымі нервамі. Гэта таксама фільм не аматарам пушыстых, мілых звяркоў, якія тут прадстаўлены як пачвары, якія хочуць запанаваць над светам. Верхаводам катоў з'яўляецца асабліва праціўны перс Пан Тінкелс, які загадаў сваім „салдатам" авалодаць хатай прафесара Броўдзі.

Прафесар займаецца вынаходствам лякарства на алергію ад сабачай шэрсці... а вынікі яго доследаў з'яўляюцца каштоўнай здабыччу для катоў. Аднак хату Броўдзіх сцеражэ шчанюк Лю, якому памагае стары сабачы агент з суседства. Лю, які моцна звязаўся з сям'ёй, асабліва з малым сынам Броўдзіх, як сапраўдны сябра не пакідае іх у найгоршыя хвіліны, а такіх у фільме шмат.

Хаця ў фільме не выступаюць людзі, а толькі звяры, ставяцца ў ім чалавечыя праблемы характэрныя дарослым: зайздрасць, барацьба за ўладу, непрыхільнасць і няшчырасць. Гэта толькі некаторыя з рысаў чалавечага характару, якія праяўляюцца ў паводзінах звяркоў-герояў .

Калі хто мае ахвоту на яшчэ адзін фільм, тады прапаную казку аб беднай сіраце з цудоўным голасам, якую адкрывае ўплывовы нью-йоркскі дыджэй. Сіротачка, як можна было дадумацца адразу, робіць вялікую кар'еру. А як праходзіць гарачае каханне з дыджэем? Ох, варта даведацца!

У ролі прыгожай і таленавітай сіраты пабачым на экране, трэба дадаць што ўпершыню, Марыю Карэй, якая не маючы вялікага акцёрскага таленту, сваім голасам і цудоўнай фігурай заваёўвае зацікаўленасць гледача.

Паўліна Шафран

Жывыя абразкі роднай гісторыі

„Нарысы па гісторыі Беларусі"* Юры Весялкоўскага не прачытаеш за адзін вечар. Па-першае, у кнізе семсот старонак і гэта фізічна немагчыма, а па-другое, такі стаханаўскі подзвіг і непатрэбны. Куды лепш яе чытаць не спяшаючы, па раздзелах, прыглядаючыся ўважней уваскрэслым героям і падзеям сівой мінуўшчыны.

Аўтар, хоць і прадстаўляе гісторыю Беларусі ў лінейны спосаб, пачынаючы аповедам пра беларускія плямёны, а канчаючы паўстаннем Тадэвуша Касцюшкі і канцом Рэчы Паспалітай, але насамрэч піша як быццам асобныя расказы, якія можна чытаць і не па чарзе. Ва ўступным слове Юры Весялкоўскі заяўляе: „... свае нарысы па гісторыі Беларусі да 1795 году не лічу навуковай працай, бо сам не зьяўляюся прафэсійным гісторыкам, а толькі звычайнымі гістарычнымі эсэ". Поўнасцю пагаджаючыся з аўтарскім вызначэннем жанру кнігі, варта дадаць, што гэтыя эсэ напісаны лёгка, з літаратурным талентам. Перад намі паўстаюць не нейкія трафарэтныя, кніжныя героі, а жывыя, паўнакроўныя постаці, са сваімі норавамі і страсцямі.

Гартаючы старонкі кнігі, як быццам бачым намаганні Усяслава Чарадзея, — які за ноч, абярнуўшыся ў ваўка, пераадольваў дарогу з Кіева ў Полацак, — пабудаваць магутнасць сваёй Бацькаўшчыны, Полацкага княства, перажываем разам з вялікім князем Вітаўтам яго няздзейсненыя мары аб каралеўскай кароне ці ўдзельнічаем у з'ездах магнатаў, шляхты, духавенства, якія заключалі палітычныя і рэлігійныя уніі. Аўтар карыстаецца магчымасцямі, якія дае яму жанр эсэ і не цураецца сваіх ацэнак людзей ды ўласнай інтэрпрэтацыі падзеяў. Не з усімі тэзісамі трэба чытачу згаджацца, не ўсе цытаваныя крыніцы, асабліва газеты ці часопісы, вытрымліваюць выпрабаванне часу. Некаторыя тэрміны, як хаця б паўтараная некалькі разоў „эксплуатацыя працоўных мас феадаламі" пахнуць нафталінам. Тым не менш, варта ўчытацца ў аргументацыю Юры Весялкоўскага, нават дзеля таго, каб паспрачацца з аўтарам. Крытычнае прачытанне кнігі заўсёды абагачае.

Цікавы і адназначны, напрыклад, погляд Юры Весялкоўскага на паўстанне Тадэвуша Касцюшкі, якога ў пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя ў Беларусі свядомая інтэлігенцыя аб'явіла нацыянальным героем. Весялкоўскі лічыць, што незалежна ад месца нараджэння начальніка Польскай дзяржавы і яго праваслаўных каранёў, змагаўся ён за інтарэс Польшчы і палякаў, а не Вялікага княства Літоўскага і яго грамадзян. „Перамога паўстаньня Касьцюшкі, — цытуе ён у завяршэнні кнігі словы Уладзіміра Казберука з „Полымя" н-р 2 за 1995 год, — раз і назаўсёды пахавала-б беларушчыну як такую, паставіла-б крыж на ідэі



нашага нацыянальнага адраджэньня". Усім апанентам такога тэзісу прыпомню, што паўстанне Касцюшкі было ў абарону Канстытуцыі 3 Мая, якая ліквідавала, няхай сабе і фармальную ўжо ў той час, адасобленасць Вялікага княства Літоўскага ад Польскай Кароны.

Кніга павінна задаволіць не толькі аматараў палітычнай гісторыі, але і тых, якія любяць бытавыя раманы. Гэтым рэкамендую гісторыю вянчання Ягайлы з Ядвігай. Хоць не зусім пагаджаюся з ацэнкай аўтара: „... якая можа быць любоў Ядвігі з Ягайлам? Была гэта дзіўная пара. Гадамі кароль старэйшы быў за каралеву ў тры разы, а ростам на голаў меншы". Па-першае, у каханні ўзрост не самы важны, па-другое, Ягайла прывёз з сабою скарбы, якія не памясціліся ў пакоях Вавеля (а якая жанчына паставіцца да гэтага абыякава), а па-трэцяе, вось што пісаў Мікола Гайдук у сваім цыкле „Шляхам гадоў" („Ніва" 25.10.1987) пра тое, як Ядвіга выслала свайго пасланца, каб агледзеў „усходняга дзікуна і страшылішча": „Альгердавіч, зведаўшы ад сваіх шпіёнаў пра такую асаблівую місію пана Завішы з Алесніцы, запрасіў яго разам у... лазню, каб даць таму магчымасць дакладна прыглядзецца ўсім падрабязнасцям. Мабыць той не знайшоў ніякай заганы, бо потым даносіў сваёй пані, што: у Ягайлы цела складнае і прыстойнае, погляд вясёлы і твар сухашчавы, зусім не брыдкі, як то іншыя расказваюць".

Пра такога пасланца Ядвігі ўпамінае і Юры Весялкоўскі, адно піша, што быў ім нейкі Гневаш. Тым не менш, гэты Гневаш, задаволены гасцінным прыёмам, „вярнуўся да Ядвігі і расхваліў Ягайлу". Дык можа і не такі страшны быў заснавальнік дынастыі Ягелонаў, першы ўладар дзвюх дзяржаў: Польскай Кароны і Вялікага княства Літоўскага.

Мікола Ваўранюк

*Юры Весялкоўскі, *Нарысы па гісторыі Беларусі*, сс. 710, Лёндан-Беласток 2002.

І так бывае...

У руках трымаю лістоўку да ўсіх беларусаў — спадкаемцаў шматвекавой культуры і рэлігіі „рускай" — з заклікам назваць сваю нацыянальнасць у ходзе ўсеагульнага перапісу насельніцтва. Заклік падтрымалі больш за 60 аўтарытэтных асоб. Сярод іх Сяргей Лукашук — вядомы дзеяч, шматгадовы дэрэктар Бельскага дома культуры. Гэты сціплы, са шчырай усмешкай прафесіянал, вядомы таксама па-за межмі Бельшчыны, карыстаецца папулярнасцю ў грамадстве.

Незразумелым для мяне з'яўляецца тое, што ў спісе прыхільнікаў звароту не стала такіх гайнаўскіх дзеячаў, як М. Байко, М. Голуб, М. Бушко. Ці яны не так папулярныя ў сваім асяроддзі, як іншыя дзеячы? Відаць, прыйдзецца ім пачакаць чарговай адозвы.

Віктар Бура

Лазаравы наследнікі

Ад шасці гадоў паломнічае на Святую Гару Грабарку. На пілігрымку збіраецца ў Лазараву суботу, напярэдадні Вялікага тыдня, перад Вербніцай. Сёлета пайшоў з дваюрадным братам з Гарадка. Выходзілі з Нарвы раніцай. Ішлі найкарацейшай дарогай: Ляды, Стары Корнін, Істок, Вітава, і адтуль чыгуначным пуцём у Кузаву...

Андрэй Жамойда працуе з маёй дачкою Алінай на мясакамбінаце. Калі загаварылі аб пілігрымцы, і Андрэй запытаў, ці можна яму спыніцца ў Кузаве на адпачынак, яна не адмовіла.

Прыехала абеднім цягніком у суботу перад Вербніцай. Памагала маці ў падрыхтоўцы пачастунку. На адвячорку надышлі пілігрымы.

— Знаёмцеся, — зарэкамендавала Аліна. — Гэта бацькі мае...

— Андрэй, — паціскаючы руку адказаў сімпатычны „велікан" (незнаёмец быў высокага росту). — А гэта мой дваюрадны брат, Янка, з Гарадка, — рэкамендаваў спадарожніка.

Пакуль жонка рыхтавала вячэру, госці папрасілі прасушыць плашчы і абутак (стаяла халоднае дажджавое надвор'е).

— У колькі з Беластока выходзілі? — спытаў я пілігрымаў.

— З Нарвы раніцай у 4^{15}, — адказаў Андрэй Жамойда. — Там на аўтамабілі падвезлі. У мясцовай царкве памясціліся ды ў дарогу сабраліся. Ішлі найкарацейшай дарогай: Ляды, Стары Корнін, Істок, Вітава і адтуль чыгуначным пуцём у Кузаву...

— Без адпачынку?

— Часам спыняліся, каб глыток вады праглынуць ці бот паправіць, — паясніў Андрэеў спадарожнік. — Пятнаццаць мінут на прыпынку ў Вітаве пасядзелі. Пэўна каля шасцідзесяці кіламетраў будзе...

З гарачай гарбатай і смажанай рыбай (паломнікі стрымоўвалі строгія правілы Вялікага посту) завязалася размова. Знайшліся супольныя тэмы, паколькі Альшанка (адкуль Жамойда родам), як і Гарадок былі мне вядомымі мясцовасцямі.

— Адкуль узялася ідэя паломніцтва?

— Думка зрадзілася шэсць гадоў таму, — пачаў аповед Жамойда. — На Вербніцу мне мела скончыцца трыццаць гадоў. Дагэтуль не задумоўваўся, як адзначу юбілей. Вярнуўшыся ў пятніцу з работы, не застаў жонкі ў хаце. Сеў на канапе і задумаўся. Успомніў дзяцінства і бабулю Вольгу, пры якой у Альшанцы выхаваўся, яе маленькую хатку і заблудаўскага святара, які навучаў рэлігіі. Дзевяцігадовы хлапчук вучыўся Закону Божага і ўпершыню ў дзіцячым сэрцы загасцявала вера любові да адвечных хрысціянскіх традыцый і Праваслаўнай царквы.

— А чаму ж бы мне не падацца ў паломніцтва і на Святой Гары Грабарцы памаліцца. Падзякаваць Богу за тое, што доля падарыла: здароўе, кватэру, добраплатную пасаду і пашану, якой карыстаўся ў крузе сяброў?

Калі жонка вярнулася дадому і ўбачыла ранец падрыхтаваны для дарогі, дык запытала:

— А куды ж гэта збіраешся?

— На Грабарку, з пілігрымкай...

Жонка недаверліва паглядзела блукаючымі вачыма. Загаварыла аб недарэчнасці задумы і аб тым, што ў дарозе можа здарыцца. Не пераканала. Сіла волі была мацнейшай. Як задумаў, так і рашыў. Дзень і ноч ішоў з Дайлідаў. Драўляны крыжык у руках, уласнаручна зроблены, задума над мінулым і царкоўная музыка з магнітафоннай касеты спадарожнічалі адзінокаму пілігрыму. На Вербніцу, у трыццацігоддзе з дня нараджэння аддаваўся я малітве. З таго часу штогод паломнічаю. Паколькі ўпершыню адзінока паломнічаў, дык на наступныя пілігрымкі сяброў падбіраў. Часам на рабоце, а часам з ліку сваякоў.

— Гэта ўжо сямейная традыцыя, — паясняе Янка Паўлушэвіч. — Андрэева бабулька трыццаць восем гадоў паломнічала...

І я пачуў другі аповед.

У бабулі было сямёра дзетак. Двое памерла. На дзевятым годзе жыцця сыночак Росцік страціў зрок. Што не рабілі, да якіх медыкаў не кідаліся, дык нічога не памагала. Мясцовыя старажылы параілі з пілігрымкай на Грабарку схадзіць. „Пайдзі, Вольга, — гаварылі, — на Грабарку і памаліся ў святым месцы. Можа Усявышні памілуе, верне сыночку зрок".

Пайшла бабулька з пілігрымкай на Грабарку, як св. Лазар на пакуту. Гэта было ў суботу перад Вербніцай, напярэдадні Вялікага тыдня. Шчыра малілася. У наступным годзе зноў пайшла. Так мінула дзесяць гадоў паломніцтва. Калі здавалася, што і Бог не хоча выслухаць пакутніцу, дык стаўся цуд. На адзінаццатым годзе, вярнуўшыся з Грабаркі ўгледзела Росціка з вясёлай усмешкай. Сыночку вярнуўся зрок. Але бабуля не спыніла паломніцтва. Надалей хадзіла на Грабарку. Збіралася традыцыйна ў Лазараву суботу. Бабуля карысталася добрым здароўем. У Заблудаў пешшу хадзіла. Аднавяскоўцы неаднойчы пыталі яе сустрэўшыся на вуліцы: „А колькі табе, Вольга, гадоў?" А яна адказвала: „Дзякуй Богу, васемнаццаць мінула". Была вясёлай, жыццярадаснай аптымісткай. Нават у цяжкія дні, пасля напаткаўшага яе гора, калі дзядуля Андрэй на сорак сёмым годзе памёр, пакідаючы яе з сямёркай дзяцей, аддавалася паломніцтву 38 гадоў.

На тварах гасцей адлюстроўвалася стомленасць.

— Дык можа прыляжаце?

— З вялікай ахвотай. Перад дзесятай прабудзіце, — папрасіў Андрэй маю дачку.

Мігам сцяклі дзве гадзіны. Калі паломнікі ўсталі, я намякнуў аб задуме напісаць допіс у „Ніву". Андрэй не толькі адобрыў ідэю, але дадаў:

— Не ведаю, ці гэта важна. Раскажу яшчэ адну гісторыю...

Да кума нарачонай прыехала сяброўка з Беларусі. Запрасілі яе на дыскатэку. Ідучы з Інай (так дзяўчына называлася), запытаў: „Пэўна хутка замуж выйдзеш?" На твары сяброўкі ўгледзеў смутак.

— У чым справа? — пытаюся.

— Я не хрышчана...

На другі дзень я сказаў бацьку аб гэтым. Ён зразу ж падаўся да а. Місеюка. Святар адказаў: „Заўтра ахрысцім".

Калі я сказаў дзяўчыне, што трэба купіць крыжык, бо пры абрадзе хрышчэння спатрэбіцца, дык Іна адказала:

— Я з сабой прыхваціла.

І паказала каталіцкі крыжык.

— Патрэбны праваслаўны, — гавару. — У царкве купім.

Калі а. Місеюк спісваў персанальныя даныя сведкаў, спыніўся пры маім прозвішчы.

— Хвілінку пачакайце, — для вас, здаецца, пасылка ад паўгода залежваецца.

Выйшаў з царквы і незадоўга вярнуўся з невялічкай упакоўкай. Калі я адчыніў яе, дык убачыў іконкі з крыжыкамі. Прыгадаў тады, як пасылаў ліст у Грэцыю ў манастыр і прасіў, каб мне іх прыслалі. Я ўзяў крыжык і даў Іне.

Паломнікі сабраліся ў дарогу. Узялі напрамак на Мядзвежыкі, Баравікі і Нурэц-Вёску. Адтуль на Грабарку. На развітанне Андрэй сказаў:

— Заўтра будзем адзначаць маю гадавіну шлюбу. Будзем таксама маліцца за ваша здароўе і за тое, каб на рабоце нікога не ўвольнілі, — кінуў у бок дачкі.

Госці выйшлі, але праз некалькі мінут пачулася груканне ў акно. Калі жонка адкрыла дзверы, дык убачыла Жамойду.

— Асноўнае забыліся, — з усмешкай заявіў.

Тады мы ўспомнілі аб двух крыжыках, якія жонка на шафу паклала.

— Гэта знак, што да вас яшчэ вернемся, — пачуўся жартоўны голас госця.

Уладзімір Сідарук

Праваслаўнае школьніцтва даўней і сёння

У Цэнтр праваслаўнай культуры ў Беластоку на двухдзённую (17-18.05.2002 г.) канферэнцыю прыбылі госці з усяе Польшчы і замежныя. Быў сярод іх таксама каталіцкі беластоцкі мітрапаліт Войцех Земба. Даклады рыхтавалі спецыялісты ў галіне ролі і развіцця праваслаўнага школьніцтва — гісторыкі, методыкі, юрысты — з Варшаўскага універсітэта, Універсітэта ў Беластоку, Універсітэта ў Торуні, Хрысціянскай тэалагічнай акадэміі, з Пецярбурга, з Румыніі. Гэта ўжо трэцяя канферэнцыя, прысвечаная папулярызацыі гісторыі Праваслаўнай царквы ў Рэчы Паспалітай (папярэднія датычылі ролі Царквы і манастырскага жыцця). Агранізатарамі яе былі Праваслаўная Бельска-Гданьская епархія, Інстытут гісторыі культур пагранічча аддзялення сацыялогіі Беластоцкага універсітэта і Праваслаўнае брацтва св.св. Кірылы і Мяфодзія.

Архіепіскап Іакаў, які ва ўступным рэфераце расказваў пра розныя формы школьніцтва ў пачатках хрысціянства, м.інш. пра школы катэхуменату ў хрысціянскіх гмінах і тэалагічныя школы, прыпомніў словы Хрыста: „Ідзіце і навучайце ўсе народы". Задачы першых хрысціянскіх школ і зараз маюць быць знакам дасканалення чалавечнасці і лучнасці з Богам.

Архібіскуп Земба падкрэсліў супольныя задачы хрысціянскага навучання заходніх і ўсходніх цэркваў, і разважаў, ці правільна чыняць касцёлы, стараючыся ствараць ці пераймаць свецкія школы, і ці гэта адзіная магчымасць у барацьбе з апаноўваючым маладое пакаленне бязбожніцтвам. Бельскі архіепіскап Грыгорый звярнуў увагу на тое, што навучаць могуць толькі тыя, хто атрымаў дар мудрасці. Прафесар Антон Мірановіч з БУ расказаў пра пачаткі праваслаўнага школьніцтва, якое ў Польшчы сягае XV стагоддзя, а таксама пра планы стварэння тэалагічнага аддзялення ў Беластоцкім універсітэце. Д-р Тамаш Кэмпа гаварыў пра Астрожскую акадэмію, прафесар Мікалай Нікалаеў з Пецярбурга — пра бібліятэку Жыровіцкага манастыра, Таццяна Корзякару з Румыніі — пра некаторыя пытанні праваслаўнага школьніцтва ў XV-XVII ст.ст. у Малдове і Валахіі, Людміла Утрутка — пра гісторыю Магілянскай акадэміі. Пра царкоўнае школьніцтва ў XIX ст. разважала мгр Галіна Сурыновіч (шкада, што не была

Айцец Грыгорый Сасна, Яўген Чыквін, Мікола Нікалаеў, Яраслаў Матвяюк.

запрошана на канферэнцыю д-р Ірэна Матус, аўтарка трох — адной выдрукаванай — прац на гэту тэму на нашай тэрыторыі).

У другі дзень канферэнцыі выступілі жэшаўскі ксёндз праф. Станіслаў Набыванец з дакладам „Катэхізацыя і праваслаўнае школьніцтва на Любліншчыне ў міжваенны перыяд", мгр Уршуля Паўлючык — пра духоўныя семінарыі ў Крамянцы і Вільне, д-р а. Юры Тафілюк — пра праваслаўнае школьніцтва ў паваеннай Польшчы, д-р Ян Зенюк — пра навучанне праваслаўнай рэлігіі ў паваеннай Польшчы, д-р Яраслаў Матвяюк — пра юрыдычныя падставы навучання праваслаўнай рэлігіі ў Польшчы.

Усе даклады будуць апублікаваны асобнаю кнігай, якая выйдзе з друку ў другой палове года, разам з дакладамі непрысутных даследчыкаў — Тэрэсы Хынчэўскай-Генэль пра Кіеўска-Магілянскую акадэмію, Ірыны Базылёвай пра Ірмалагіён як падручнік для навучання царкоўнай музыкі ў XVII-XVIII ст.ст., а. Аляксея Курыловіча пра царкоўнае школьніцвта ў II Рэчы Паспалітай, праф. Мар'яна Бэндзы пра праваслаўную секцыю ХАТ у Варшаве і Дарыюша Малашэўскага пра навучанне рэлігіі на тэрыторыі Вроцлаўска-Шчэцінскай епархіі.

Міра Лукша
Фота аўтара

Думала — выканчуся



Надзея ФЕДАРУК, народжаная ў Рэпісках у 1922 годзе.

У 1942 годзе солтыс вызначыў пяць дзяўчат з нашай вёскі на капанне бульбы. Павезлі нас у Нарву, а з Нарвы яшчэ кудысь і далей поездам. Капалі бульбу да марозаў, матычкамі валілі. Пасля завезлі нас у арбайтсамт у Аструду. Папрыязджалі паны і забіралі нас. Мы з суседкай вішчалі:

— Куды і чаго нас везяце?!

Завезлі нас у Пількопен; яе далі да багатага, а мяне да беднага гаспадара. Будынкі былі растрэсены, многа дзяцей малых. Гаспадар піў, а гаспадыня лічыла сябе вялікай паняй. Было восем кароў і двое коней. Я аднаго коніка запрагала ў керат, вочы яму мехам затуляла і так сечку рэзала. Поўная клуня снегу, салома мокрая, сячкарня не цягне... І ў лес па хвораст сама ездзіла. Нічога на сабе не мела: ні майтак, ні панчох. Ногі паадмарожвала ў снезе ў лесе. Студня на сорак восем кадлубкаў глыбокая была і трэба было нацягаць вады для таго дабытку. Думала — выканчуся...

Іншыя паны не такія былі. Сяброўка толькі качак і курэй глядзела. Там і французы ды палякі былі. Калі яшчэ мой гаспадар памагаў, то лягчэй было, але як яго на вайну ўзялі, то гора! Далі мне старога француза, якому сапляк з носа вісеў. Па ім вошы лазілі і я яму бялізну ў катлах выварвала. Ён крыху каля дабытку тоўкся, малако выносіў. Я кароў даіла, дзяцей даглядала. Гаспадыня дзяцей малых да сябе не брала, толькі да мяне адпраўляла. Я з дзецьмі спала і малако ім грэла. А яна прыбягала ўначы з крыкам да мяне, чаго дзеці плачуць, чаго вішчаць. І я плакала.

Пасля хвароба хапіла мяне, кароста, кругом гузы абселі. Забралі мяне ў шпіталь, падлечылі. Яна тады дзяцей ад мяне забрала і ў неабагараваны дом перавяла. Дала водпуск дадому. Француз вёз мяне, а я яму сказала, што не ведаю, калі вярнуся. Француз сказаў гаспадыні і тая паведаміла паліцыю.

А ў Рэпісках меў солтыс іншую вызначыць; мама яму ўсё насіла, каб іншую вызначыў, але не знайшоў. Жандармерыя па мяне наязджала, а я тры месяцы хавалася. Паехала да бабулі ў Дубіны, у яе начавала. Прыехаў тата ў дзве гадзіны ночы з дванаццацю паліцаямі і будзіць мяне, што хату будуць паліць. Бацькі злякаліся і давай па мяне ехаць.

Схапілі мяне немцы і павезлі. У Рэпісках нават у хату не пусцілі, завезлі сваёй карэтай у Бельск. Было гэта пад вясну — яны спераду ехалі коньмі, а мама з татам — ззаду, кусок хлеба ўзялі. Развіталася я з імі і пасадзілі мяне ў лагер. Забралі ў лазню, там рускі стораж сядзеў. Ён абяцаў бацькам, што ўсё мне будзе даваць, але ён усё ад бацькоў сабе забіраў.

Прасядзела я там тры тыдні. Заганялі кіркамі брук дзерці. На шпацыры сабакі нас пільнавалі, яшчэ і сёння сляды ад сабак маю. Давалі хлеб з кавай. Тата прыязджаў, згортваў вошай з мяне і плакаў: „за што?" Мой хлопец з нашай вёскі мне ежу дастаўляў і кідаў мне хлеб праз дрот, бо нельга было даваць. Як не заўважаць, то схаваеш, а як пабачаць, то паб'юць. Ганялі і сабакамі чавілі. І гумамі смаляць:

— Хто табе даў той хлеб?!

Яны мне здароўе забралі, так мучылі там. І цяпер нам не прызнаюць таго лагера.

Забралі мяне з лагера, а я прасіла, каб да іншай гаспадыні мяне далі.

— Ужо ты сваё адмучылася, — сказалі і адправілі мяне ў Кёнігсберг.

Сядзімо там, ідуць пані з панам у капелюшах. Пытаюць мяне, чаму я абстрыжана, а я адказваю па-нямецку, што ў нас такі фасон. Забралі яны мяне ў Тыльзіт. Там лягчэй было, але гаспадары інакш здзекаваліся з мяне — адносіліся да мяне як да прадмета, як да цацкі, з якою ўсё можна рабіць. Жылі яны над вадою, было ў іх пяць пакояў для гасцей. Апраналі мяне добра, пані разам са мною прала і ўдзень адпачываць мяне адпраўляла. Забіралі мяне з сабою на шпацыр.

Пабыла я ў іх сем месяцаў і ў водпуск мяне выслалі. У капялюш адзелі. Пабыла я дома і тата з мамай мяне ў Бельск адвезлі.

Памерла пані маці і яе, наспіртаваную, сем дзён трымалі, а мяне клалі каля яе, каб ноччу пільнавала. А які ж гэта сон побач мерляка ляжаць? Як яе пахавалі, то мяне пакінулі ў тым пакоі начаваць. Пані страшыла мяне, што прыдзе *ома* і возьмецца за мяне. І ў адну ноч цішком прывязала да маёй коўдры шнурок і да свайго ложка працягнула. Ноччу — шусь! — пярына з мяне зляцела... Я са страху не магу паварушыць ні рукою, ні нагою. А яна га-га-га! Але пан прыбег і на яе за тое насварыўся. Некалькі начэй начавала я ў іхнім пакоі, а пасля перавялі мяне ў іншы і больш не знуткаваліся з мяне.

Гаспадар быў цырульнікам і трымаў толькі адну карову, якую я даіла і пасвіла. Пасля, мо праз год, забралі мяне да наступных, старэнькіх гаспадароў, бо ў маіх замала мне работы было; я тых старых даглядала. Іхні сын на вайне быў, а нявестка паехала да сваіх бацькоў; яны прасілі, каб ад рускіх іх бараніць. Была я ў іх мо тры месяцы.

У адну ноч грукат. Рана прыйшлі рускія і старых выгналі на мароз. Яны прасілі мяне, каб цельных кароў даглядзець. Пачуў адзін рускі:

— Так что ты, б..., с немцами разговариваешь?!

— А што я маю рабіць?

— Становись к стенке, сейчас убъю!

Але адчыніліся дзверы і іншы крыкнуў на яго:

— Что ты делаешь? Что она виновата?

Першы апусціў рукі. Я асталася жыць. А другі выгнаў першага, адчыніў склеп, там поўна слояў з мясам было і ён пабіў іх...

Да мяне прыйшла сяброўка і мы пабеглі шукаць такіх, як і мы. Па трупах бяжымо. Яшчэ жывыя крычаць, каб іх дабіць або ратаваць... Адна руская сям'я прыняла нас.

Я заглянула да сваіх гаспадароў на панадворак. А там каровы пацяліліся, цяляты паздыхалі, свінням шынкі выразалі і пакінулі. Смурод! Запрэгла я коніка ў брычку, узяла муку, цукар, лахі і вязу ў новае месца. А там палкоўнік крычыць на мяне:

— Вон, полячка!

Ноч, ракеты, я прашу, каб пакінуў мяне, але ён выгнаў. Еду, месяц свеціць, пажары. Ззаду хтось маторам едзе:

— Воротись, б...!

Завярнула я коніка і вярнулася да той сям'і, што мяне была прыняла. Была я з імі да таго часу, калі іх у Маскву адпраўлялі, а мяне ў Брэст. Далі дакументы і я з сяброўкаю ў Брэст едзем. У поездзе я заснула і ў мяне ўсё ўкралі; ні торбы, ні дакументаў.

Пасадзілі мяне ў Брэсце ў падвал з пацукамі, пакуль праверацъ і дадуць дакументы; тры тыдні чакаць трэба было. Сяброўка тая намовіла мяне, каб у яе пакінуць рэчы, а самой не чакаючы дакументаў перайсці граніцу. Не ўдалося мне перайсці граніцу, затрымалі мяне і ў лагер у Брэст пасадзілі. А там пацукі вочы мне хвастамі выбіваюць. Неяк я тыя тры тыдні прасядзела.

Далі мне дакументы. Сяброўка мая замкнулася і рэчаў маіх не аддала. Заехала я ў Чаромху, там адна жанчына забрала мяне пераначаваць. Сказала мне ехаць на вугальным поездзе, бо іншыя не хадзілі. Села я на той поезд, папрасіла, каб да Гайнаўкі мяне давезлі. Дасталася я да бабулі ў Дубіны, а ад яе дадому. Вярнулася я, як капусту садзілі. Якая радасць была!..

З тых пяці дзяўчат, што разам са мною забралі капаць бульбу, адна пазнаёмілася з французам і выехала ў Францыю. Адна вярнулася, так, як і я. Адна ўцякла была з капання і больш яе не бралі, бо старэйшая была. А адна прапала без весткі.

Запісаў Аляксандр Вярбіцкі

Фота аўтара

Да 120-годдзя нараджэння Янкі Купалы

Трагічны герой ці рыцар веры?..

Не папе рымскаму служу
І не „свяцейшаму" сіноду!
Я аддаю сваю душу
Свайму няшчаснаму народу!
Я. Купала

Мы — сённяшнія — цвёрда ведаем адно: Купала быў няверуючы, матэрыяліст! Мы забываемся, што жыў ён сярод нас — у хрысціянскім асяроддзі, дыхаў хрысціянскай атмасферай, Бог быў недзе побач, — калі не на яве, дык у мроях.

Г. Колас „Карані міфаў"

Тое, што Купала быў каталіком, ніколі не было сакрэтам, але і асабліва не афішавалася. Пэўны адбітак на яго адносіны да касцёла зрабіў выпадак, калі прыйшлося хаваць у адзін дзень абедзвюх сястрычак, што памерлі ад шкарлятыны.

За тыдзень да гэтага праводзілі ў апошні шлях брата Казіка, а цяпер вось — Сабінка і Гэля.

„Когда впоследствии я привёз хоронить обеих сестёр вместе, то ксёндз по-

требовал двойную плату за похороны. Я запротестовал, потому что его труд был не больше ни меньше, чем при похоронах одного брата. На это ксёндз ответил, что там он брал плату за одну голову, а тут за две головы. После этого, хотя я до названного случая не был очень верующим, но этот торг „духовника" выбил из меня все остатки веры". (Ліст Л. М. Кляйнбарту ад 23.11.1927 г.).

Дапазычыўшы грошы на могілках, Купала разлічыўся з ксяндзом.

Гэтая першая душэўная рана, аднак, не перашкодзіла Янку падтрымліваць цёплыя адносіны з асобнымі прадстаўнікамі духавенства: „У суботу еду ў Стоўбцы да Коласа, а стуль да ксяндза Астрамовіча і дамоў". (Ліст Б. І. Эпімах-Шыпілу з Акопаў, 26.07.1912 года).

А калі ў студзені 1922 года Купала з гнойным запаленнем сляпой кішкі аказаўся на мяжы жыцця і смерці і газета „Беларусь" рэгулярна друкавала бюлетэні аб хваробе паэта, пры ім, акрамя жонкі, знаходзіўся рэктар рымска-каталіцкай духоўнай семінарыі ксёндз Абрантовіч. „Толькі дзякуючы добрай апецы, асабліва ксяндзу рэктару б. Мінскай духоўнай семінарыі Абрантовічу, я не пайшоў да Абрагама на піва" (гэты выраз знаходзім у кнізе А. Лойкі, калі аўтар апісвае трызненні хворага, яго чорныя сны: „Шынкар — чорныя блі-скучыя вочы, у чорнай ярмолцы, з-пад якой — ля вушэй — доўгія, чамусьці бела-сівыя пэйсы. Шынкар усё нізка перад Купалам у пояс кланяецца і ўсё кажа: Просім да Абрагама на піва! Просім да Абрагама на піва!").

І шлюб у далёкім 1916 годзе адбываўся ў Маскоўскім Петрапаўлаўскім касцёле, хоць ні Уладзіслава Францаўна, ні Купала нідзе аб гэтым не ўспаміналі.

Нарэшце, каб зразумець да канца Купалу, трэба ўдумліва прачытаць яго „Сон на кургане". „Той свой «сон» Купала расказвае нам. Расказваючы, ён тады яшчэ не ведаў, што тых «нас» цяпер ужо няма, а сённяшнія «мы» не ўмеем разумець тых сноў" (Блок прадчуваў: „Повествовать ещё не жившим")...

Тады — „мы" ведалі, што відмы, цмокі ды русалкі — гэта ледзь не хатнія жывёлы, — нездарма ў Купалы некаторы з нас „Самога чорта нёс пад пахай, /З самою ведзьмай цалаваўся". Тыя „мы" былі знаёмыя і з Клюевым, і з Ібсенам, і з К'еркегорам, дый з Фрэйдам. У тых „нас" яшчэ сядзела ў генетычнай памяці сімволіка драматургіі беларускага барока, тыя „мы" — чыталі „Біблію"... (Г. Колас).

Тамара Лаўрэнчук, г. Высокае

Даведнік для дзяўчат

Дзяўчына, Хлопец і размова

У апошнім выпуску „Даведніка” я ўжо заўважыла, што мужчыну нельга зразумець. Тады родзіцца ў маёй прыгожай галоўцы пытанне: „Як людзі маюць жыць, калі ўзаемна не разумеюцца?” Жыццё жыццём, але як маюць з сабой размаўляць?! Для дзяўчат гэта справа выключнай важнасці — яны ж шукаюць хлопцаў, ходзяць на спатканні — дык што маюць там рабіць? Зразумела — размаўляць! Папраўдзе, чула я, што сёння не кожны ўжо гэта прабуе; некаторыя пераходзяць адразу далей... але я мяркую, што нашы Хлопец і Дзяўчына да іх не належаць.

Вось здараецца: Хлопец забірае Дзяўчыну на шпацыр. А тады...

Першая магчымасць такая, што Хлопец нібыта пачынае гутарку, размаўляюць пяць хвілін, а пасля ён раптам спыняецца і пытае: „Табе не нудна? Скажы нешта!”. Дзяўчына хутка адказвае, што ёй сапраўды вельмі прыемна... што ж, калі Хлопец ёй да канца не давярае і праз хвіліну зноў пытае: „Ці табе не нудна? Можа цяпер ты нешта скажы?”

У другім выпадку Хлопец стараецца не нудзіць Дзяўчыну інакш. Ён менавіта гаворыць безупынку... гэта пэўна не вельмі прыемнае для самое Дзяўчыны, але калі яна цярплівая і разумная, умее такі „лівень слоў” выкарыстаць. Бо чалавек, а нават такі Хлопец, размаўляючы безупынна дзве гадзіны, напэўна скажа прынамсі адну рэч, якая нас зацікавіць: „Ведаеш, у маёй кошкі блохі!” (гмм... гэта хіба не была адна з тых рэчаў...). Але якраз такога Хлопца Дзяўчына можа без вялікай намогі хутка „амарочыць”. Справа ў тым, каб гэты дзець Хлопцу ў вочы і раз на некалькі хвілін сказаць з перакананнем: „Сапраўды?”, „Немагчыма!”, „І ты сам гэтае выдумаў?”, „Ах!”, „Ох!”. Хлопец, магчыма, падумае, што Дзяўчыне вельмі прыгожа з гэтымі задуманымі вачыма (яму не трэба ведаць, што яна якраз плануе сваю сённяшнюю вячэру...).

Яшчэ адным, цалкам дзіўным зрэшты, спосабам на гутарку ёсць „допыт”. Хлопец быццам хоча ў адзін вечар даведацца пра Дзяўчыну ўсё, але памятайце — нельга на першым спатканні цалкам сябе рассакрэціць, бо што тады будзе мужчыну трымаць пры вас? Калі Хлопец выцягвае з вас шораз новыя інфармацыі, варта яго спытаць, ці не хацеў бы ў будучыні працаваць дэтэктывам. Хаця, магчыма, не зразумее вашага намёку...

Не магу таксама не сказаць, што здараецца і так: пара людзей розных полаў даволі добра сябе разумее, надта лёгка ім з сабой размаўляць! Аб чым гэта можа сведчыць? Не думайце! Гэта сведчыць толькі і выключна аб тым, што яны сябе нават не слухаюць і таму здаецца, што такія згодныя! Дарэчы, з такіх людзей родзяцца пасля найбольш згодныя сужонствы...

Яўдося
jeudosia@wp.pl

Сужонства з Амерыкі шукае няньку (праваслаўную беларуску ва ўзросце 50-55 гадоў) да траіх дзяцей. Кантакт: (0 10xx 85) 730 71 03.

Пераможцы турніру і іх апякун Славамір Чыквін.

Сярод пераможцаў

Гайнаўскія белліцэісты Аркадзь Хіліманюк, Андрэй Аніщук і Адам Семянюк занялі трэцяе месца ў Ваяводскіх элімінацыях Агульнапольскага матарызацыйнага турніру арганізаванага 30 красавіка ў Беластоку для вучняў сярэдніх школ. Раней сталі яны чэмпіёнамі Гайнаўскага павета, затым перамаглі на спаборніцтвах паўднёвай акругі Падляшскага ваяводства, якія адбыліся ў Сямятычах. Там апярэдзілі найлепшыя каманды Беластоцкага, Бельскага і Сямятыцкага паветаў. У ваяводскіх элімінацыях белліцэістаў апярэдзілі вучні з Ломжы і Шчучына, а за гайнавянамі апынуліся вучні з Сувалкаў.

Самымі складанымі аказаліся змаганні ў Беластоку. Вучні Гайнаўскага белліцэя занялі другое месца, адказваючы пісьмова на пытанні аб дарожным руху, сабралі найбольш балаў па практычным прымяненні першай медыцынскай дапамогі і апынуліся на другім месцы адказваючы на пытанні па гісторыі мотаспорту. За язду на матацыкле занялі трэцяе месца і такое ж месца прызначылі ім за падмену шыны ў машыне. Чацвёртае месца дасталася гайнавянам за язду на машыне. Пасля генеральнага падліку аказалася, што белліцэісты апынуліся на трэцім месцы.

— У гэтым годзе вучні вельмі добра падрыхтаваліся тэарэтычна і салідна трэніравалі язду на машыне, — заявіў апякун белліцэістаў, настаўнік інфарматыкі Славамір Чыквін. — Але найгорш атрымалася менавіта язда на машыне. У гэтым спаборніцтве патрэбны вялікія ўмеласці. Трэба было вельмі хутка ездзіць паміж перашкодамі, робячы павароты з выкарыстаннем ручнога тормаза. Рыхтаваліся мы да гэтай канкурэнцыі, але на другой машыне зусім іншая язда.

Аляксей Мароз
Фота аўтара

Музейны фонд

Грамадскі камітэт пабудовы Музея і асяродка беларускай культуры ў Гайнаўцы праводзіць збор грошай на пабудову музея. Ахвяраванні на пабудову музея (у польскай і замежнай валютах) просім пералічваць на рахунак: **PKO BP S.A. O/Hajnówka, nr konta: 26 10201332 100120228.**

Спіс чарговых ахвяравальнікаў:

5 073.	Пётр Гаган (Гайнаўка)	1 дол. ЗША
5 074.	Мікалай Нікалаюк (Гайнаўка)	24,00 зл.
5 075.	Мікалай Суліма (Гайнаўка)	24,00 зл.
5 076.	Міхал Голуб (Гайнаўка)	25,00 зл.
5 077.	Аляксей Харкевіч (Гайнаўка)	45,00 зл.
5 078.	Дары сабраныя ў скарбонку ў Музеі 19 лютага г.г.	100,00 зл.
5 079.	Канстанцін Лукашэвіч (Беласток)	40,00 зл.
5 080.	Комплекс школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы	20,00 зл.
5 081.	Дары сабраныя ў скарбонку ў Музеі 28 лютага г.г.	119,25 зл.
5 082.	Уладзімір Іванюк (Вітава)	30,00 зл.
5 083.	Ян Сухадола (Гайнаўка)	72,80 зл.
5 084.	Ян Зенюк (Беласток)	50,00 зл.
5 085.	Юльян Казбярук (Гайнаўка)	30,00 зл.
5 086.	Валянціна Клімук (Гайнаўка)	50,00 зл.
5 087.	Іаланта Вішнеўская (Гайнаўка)	25,00 зл.
5 088.	Галіна Маліш (Гайнаўка)	25,00 зл.
5 089.	Мікалай Клімюк (Гайнаўка)	36,00 зл.
5 090.	Віктар Бура (Гайнаўка	12,00 зл.

Дзякуем.

Наш адрас: **Społeczny Komitet Budowy Muzeum i Ośrodka Kultury Białoruskiej, 17-200 Hajnówka, ul. 3 Maja 42, tel. (085) 682 28 89.**

Водаправоды, каналізацыя, дарогі

У Нараўчанскай гміне ў мінулым годзе пабудавалі водаправод да вёскі Навіны, Кругліка і да леснічоўкі ў Альхоўцы. Цяпер будуюць яго ў прысёлак Парослае.

Шмат зроблена ў галіне пабудовы санітарнай каналізацыі. У мінулым годзе здалі яе ў карыстанне ў Янове, Стачку і Свінароях ды па вуліцы Гайнаўскай у Нараўцы. Закончылі пабудову ачышчальні сцёкаў у Новай Луцэ.

Гмінныя ўлады не забываюць пра пабудову ды рамонты дарог. У 2001 годзе аднавілі 1,8-кіламетравы адрэзак тракту з Міклашэва ў Лясную, 3,2-кіламетравы шлях з Альхоўкі ў Масева ды 960-метровай даўжыні вуліцу ў Скупаве. Рамантавалі дарогу, якая вядзе цераз лес з Капітаншчыны ў Ваські ды з Семяноўкі да даволі далёкіх сенажацяў у Купіне.

Пабудавалі невялікі мост на рацэ Нараўцы каля Кардона.

Апрача таго перакрылі школу ў Семяноўцы ды адрамантавалі гасцінічныя пакойчыкі ў самаўрадавай клуб-святліцы ў Старым Ляўкове (яна побач тамашняй керамічнай фабрыкі). (яц)

На пушчанскім шляху

11 мая здалі ў карыстанне веласіпедныя шляхі па тэрыторыі Нараўчанскай гміны. Вядуць яны з Нараўкі ў Белавежскі нацыянальны парк ды ў найбольш цікавыя глухія закуткі пушчы. Пры шляхах знаходзяцца інфармацыйныя табліцы, вежы. На шляху з Масева ў Баб'ю Гару пабудавалі стрэшкі, пад якімі можна схавацца ў дождж або ў летнюю спякоту.

Ровар можна ўзяць на пракат у Асяродку спорту і адпачынку ў Нараўцы. Неўзабаве можна будзе купіць спецыяльны буклет з картай, на якой будуць пазначаны веласіпедныя шляхі. Пра ўсё паклапаціліся гмінныя ўлады ды кіраўнік Праекта „Белавежскі нацыянальны парк” Сцяпан Якімюк.

(яц)

Ніва ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
Старшыня: Яўген Мірановіч.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://republika.pl/niva_bielastok/*
E-mail: *niva_bielastok@poczta.onet.pl* альбо: *niva_bielastok@skrzynka.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Віталь Луба.
Сакратар рэдакцыі: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі”: Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk”, ul. Składowa 9, Białystok.
Тэкстоў nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na III kwartał 2002 r. upływa 5 czerwca 2002 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch” na terenie całego kraju.

2. Cena prenumeraty na III kwartał 2002 r. wynosi 26,00 zł.

3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 115,00; pocztą lotniczą Europa — 127,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 153,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 12401053-40060347-2700-401112-005.

4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,40 zł, a kwartalnie — 44,20 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą lotniczą: Europa — 5,30 (68,90), Ameryka Płn., Afryka — 5,90 (76,70), Ameryka Płd., Środk., Azja — 6,50 (84,50), Australia — 8,30 (107,90). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa”, Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta PBK S.A., I Oddział Białystok, 11101154-401150015504.

Ніўка

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Піва

Халоднае, сьвежае, неразбаўленае, густое, бурштынавае, бочкавае, пеннае — памятаеце рэкляму: *піце піва пеннае!*

Што добра пад піва? Сушаны лешчык, салёны абаранак, вараныя ракі, сяброўская гутарка пра ўсё на сьвеце.

Піва прыдатнае для ацэнак: *зь ім піва ня зварыш* — не дагаворышся, не паразумеешся. А вось выправіцца *да Абрама на піва* значыць — да праайцоў, на той сьвет. Хоць на тым сьвеце, паводле наяўных зьвестак, *піва* няма — там амброзія (тым, хто заслужыў). У Бібліі *піва* ня згадваецца ані разу, хоць у Чэхіі можна купіць куфаль з тэкстам *піўнога* варыянту малітвы „Ойча наш".

Піўніцай на пачатку XX стагодзьдзя ў Беларусі называлі адмысловы склеп для захоўваньня *піва*, квасу, малака, гародніны; *піўніцы* былі драўляныя і мураваныя. *Піва* зь *піўніцы*, пэўна, смачнейшае, чымся зь сёньняшняй залезнай лядоўні.

Бровары — даўняя прыкмета беларускіх мястэчак. Неяк адзін слуцкі патрыёт хваліўся: раней казалі *„піва* няма, толькі слуцкае", а цяпер слуцкае піва — самае смачнае. *Піва* ня ёсьць нацыянальны напой для беларусаў, як для чэхаў ці баварцаў, дзе вараць тысячы гатункаў і выпіваюць сотні літраў за год, наладжваюць *піўныя сьвяты* ды *піўныя путчы*. Але ў Беларусі апошнім часам *піва* становіцца прадметам нацыянальнай гордасьці: наша *піва* — лепшае за расейскае, смачнейшае за польскае, таньнейшае за літоўскае.

Піва — паказчык таго, што ўсё ў парадку, паціху, як цяпер кажуць — нармалёва.

Хадзем на піва!

Аляксандар Лукашук
(паводле часопіса „ARCHE", 7/2000)

„Даўціпы" *Андрэя Гаўрылюка*

Гутараць два сябры:

— На працы атрымаў я ўзнагароду: уік-энд у славутым курорце. Хуценька пазваніў жонцы і спытаў ці паедзе са мною...

— І што ж яна адказала?

— „Гэта цудоўна! А хто звоніць?"

* * *

Сын, бацька і дзедка выбраліся ў Парыж. Вечарам уся тройка наведала публічны дом. Раніцай наступнага дня расказваюць:

— Ну і тэмпераментныя гэтыя парыжанкі, — сказаў сын.

— І спрактыкаваныя, — падхапіў бацька.

— А якія цярплівыя! — дадаў яшчэ дзедка.

* * *

Турыст наведаў публічны дом у Тэхасе. Забаўляючыся з бландзінкай, пабачыў праз акно, як група мужчын разбівае фундаменты суседняй кірхі.

— Не дзівуйся, — патлумачыла дзеўка. — Пад націскам мясцовых жанчын улады горада забаранілі арганізаваць бардэлі побач культавых аб'ектаў і таму нашы хлопцы вымушаны да канца месяца перавесці храм у іншае месца.

* * *

Лекар да прышчатага студэнта:

— Вам таблеткі не памогуць; вам патрэбна жанчына!

Студэнт пачынае тлумачыць, што найперш навука, забеспячэнне побыту, кватэра, і толькі пасля шлюб. Аднак лекар бярэ бланк рэцэпта і піша адрас знаёмай прастытуткі.

На другі дзень студэнт, перавязаны бінтамі, з'яўляецца к урачу ў прэтэнзіях:

— Вы не паведамілі мне, што ў яе няма дамовы з касай хворых!..

* * *

Сямігадовы Пятрусь спавядаецца, што купаўся голы ў возеры.

— Ці былі там дзяўчынкі? — пытае ксёндз.

— Не ведаю; усе мы былі голыя.

* * *

— Ведаеш, мамачка: усе хлопцы аднолькавыя!

— Гэта праўда, аднак гэта не абазначае, што штодзень трэба ў гэтым упэўнівацца.

* * *

На пляжы ў Сопаце ляжыць нудыст з прыкрытай газетай галавой. Побач яго праходзяць тры сяброўкі.

— Гэта не мой муж, — сцвярджае адна.

— Правільна: гэта не твой муж, — падхоплівае другая.

— Ён нават не з Сопата! — завяршае трэцяя.

* * *

Гутараць дзве дзяўчыны:

— Як гэтым разам сустрэла ты Новы год?

— Так як і заўсёды: у пасцелі.

— А многа мела гасцей?

* * *

Дзеўка да шафёра:

— Кожны раз, калі мяне нехта падвозіў, заўсёды псаваўся самаход.

* * *

— Ці ведаеце, што наша пакойная суседка завясціла пяць мільёнаў свайму сабаку?

— Ведаю; але чуў я, што ейны папугай хоча абскардзіць тастамент.

* * *

Баксёр пасля бою распытвае трэнера:

— І як было?

— Паглянеш у люстэрка, тады даведаешся.

Тэрарысты з-пад Дубіч

Як нядаўна я даведаўся недалёка Дубіч, зубры гэта тэрарысты. Такія гарбатыя, чатырохногія ды барадатыя. Бенладэны выпаўзаюць на палеткі сялян, дратуюць жыта і авёс. Беластоцкае тэлебачанне, пры ўторы агульнапольскага „Тэлеэкспрэса" б'е ў набат: сяляне не могуць падысці да сваіх кароў, каб іх падаіць ды загнаць на свае падворкі. На іх дарозе станавяцца якраз зубры, упартыя, бы аслы, лупяцца на надыходзячых земляробаў як валы ў маляваныя вароты. І нічога ім не зможа зрабіць ні ахоўнік прыроды, ні дырэктар Белавежскага нацыянальнага парку, бо, як кажуць, вёскі ды пашары ў дубіцкіх ваколіцах знаходзяцца яраз на іх тэрыторыі. Што застаецца земляробам? Найбольш сэнсоўна — выступіць у ААН і іншыя міжнародныя арганізацыі, каб афіцыйна аб'явілі зброю міжтэрытарыяльнымі тэрарыстамі, разаслаць за імі лісты, а пасля спаймання паставіць перад міжнародным трыбуналам. Альбо, сяляне могуць змагацца на ўласную руку. Хлебануць сотню зброўкі і — у бой! Так ці сяк — не будзе зубёр *pluć nam w twarz*!

З журналісцкага абавязку спытаўся я ў найбольш зацікаўленага боку гэтага канфлікту — у Муцькі, з адной з даткнёнай зубрыным афензівам паддубіцкай вёскі.

— Му-у-у!? — недназначна адказала яна мне і з настальгіяй паглядзела сваімі лагоднымі вачыма на поле і гарбатага агрэсара.

МакХолад

Двухлітарная крыжаванка



Гарызантальна: 1. вучоба, 3. турбота, маркота, 5. жулік, ашуканец, 7. культавая забарона, 9. нямецкі горад на верхнім Эмсе, 10. планавая замена старога сорта зерня новым, якаснейшым і прадуктыўнейшым, 11. неглыбокае месца на рацэ або моры, небяспечнае для суднаў, 12. процілегласць старту, 14. горад на Нёмане, 16. пэруанскі горад на Амазонцы, 17. вулкан у Эквадоры, 5230 м.

Вертыкальна: 1. горад над Японскім морам на захадзе Хонсю, 2. левы прыток Волгі, 3. муж даяркі, 4. камплект ігральных карт, 6. завод з механічнай выпечкай хлеба, 8. вугламерная геадэзічная прылада, 9. усталяваная рэпутацыя, 11. спецыяліст па вырабу медных рэчаў, 13. Валянцін, беларускі паэт (1914-47), 14. Гюнтэр, нямецкі пісьменнік (нар. у 1927 г.), 15. сталіца Багамскіх астравоў. (Ш)

Рашэнне крыжаванкі складуць літары з пазначаных курсівам палёў. Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку з 16 нумара

Гарызантальна: Амга, пацук, Клімаў, Орша, аблом, бацька, барыкада, абшар, адбудова, спадчына, накат, англезіт, Ландау, куцця, рынг, дынама, слуга, „Ніка".

Вертыкальна: баабаб, вучоба, марцыпан, Акаба, Ніцца, маска, маршчына, аддушнік, Анст, шлак, воўк, Кант, даведнік, Атуэль, абцугі, нарыў, адчай, Гуран.

Рашэнне: **Калі ў гаршчку не варыцца, тады і баба сварыцца, а калі ў гаршчку кіпіць, тады й баба змаўчыць**.

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** і **Лукашу Пацэвічу з Беластока**.

Фэстываль Музыкі Маладой Беларусі

Басовішча 2002

Гарадок, Беласточчына, 19-20 ліпеня 2002 г.

✓ Беларускае Аб'яднаньне Студэнтаў у Польшчы аб'яўляе конкурс на плякат сёлетняга выпуску Фэстывалю. Праекты трэба дасылаць да **15 чэрвеня 2002 г.** па адрасе **Białoruskie Zrzeszenie Studentów, c/o Redakcja „Niwy", ul. Zamenhofa 27, 15-959 Białystok** (з прыпіскай „Plakat").

✓ Беларускае Аб'яднаньне Студэнтаў у Польшчы паведамляе, што гурты, якія хочуць узяць удзел у конкурснай частцы сёлетняга выпуску Фэстывалю павінны да **20 чэрвеня 2002 г.** даслаць па адрасе **Radio „Racja", ul. Ciepła 1/7, 15-472 Białystok** (з прыпіскай „Basowiszcza 2002"):

— інфармацыю пра гурт (агульная даведка, здымак, склад, кантакт — адрас, тэлефон, эмэйл),

— запіс 20 хвілін музыкі, 70% якой павінен складаць беларускі матэрыял.

Больш інфармацыі па тэлефоне (+48) 502 753 520.

ISSN 0546-1960